ГРОШЫ Ў ДЗЯЦЕЙ ЛЕПШ КАНТРАЛЯВАЦЬ **4**

ШТО ХВАЛЮЕ СТАЛІЧНЫХ ПЕДАГОГАЎ? **5**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЖНІЎНЯ 2018 г. СЕРАДА № 165 (28781)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ЯЎСЕЕЎ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці:

«Мы аналізуем звароты грамадзян, глядзім, заявы якой тэматыкі паступаюць часцей. На дадзены момант больш за ўсё звяртаюцца па зямельных пытаннях, звязаных з індывідуальным будаўніцтвам жылля. Напэўна, прычына гэтага ў тым, што людзі сталі больш будаваць, іх дабрабыт палепшыўся».

КАРАТКА

• Мінскі аўтамабільны завод плануе распрацаваць спецыяльны аўтобус для краін Афрыкі.

• Кіраўніцтва Магілёва праінспектуе з верталёта навядзенне парадку ў горадзе.

• Больш за 450 чалавек папрасілі прытулку або дадатковай абароны ў Беларусі ў першым паўгоддзі 2018 года.

• Ураджайнасць кавуноў у Беларусі ў 2018 годзе чакаецца вышэйшая за леташнюю. У цэлым па краіне ў найбольш буйных вытворцаў занята пад кавуны 25,9 гектара, яны прагназуюць валавы збор каля 465 тон.

• Беларуская карціна «Не гульня» ўдастоена спецыяльнага прыза Музея Перамогі на XV Міжнародным фестывалі ваенна-патрыятычнага фільма «Валакаламскі рубеж».

• Сезон работы фантанаў у Мінску завершыцца 28 верасня.

• Шалёны барсук напаў на мужчыну пад Гроднам.

ISSN 1990 - 763X

ТРАВЯНЫ ЗБОР СА ЗБАРОВА

Дырэктар сельскага Дома культуры ў вёсцы Збароў Рагачоўскага раёна і кіраўнік экалагічнага праекта «Тайны гаючых раслін» Антаніна ВАРАНЦОВА нясе летні збор кветак і раслін, якія яна сабрала на дняпроўскім лузе, бо вёска знаходзіцца акурат на беразе вялікай ракі. З гэтых зёлак Антаніна Анатолеўна будзе рабіць калекцыі і зборы, а таксама заварваць чаі і напоі, карысныя для здароўя.

Чацвёрты год на базе ўстановы культуры дзейнічае незвычайны праект ПРААН, які адкрывае свет навакольнай прыроды, знаёміць з багаццем раслін, якія дапамагаюць чалавеку ўмацаваць здароўе і працягнуць маладосць. Антаніна Варанцова водзіць групы экскурсантаў і асобных турыстаў па залах музея і раскрывае таямніцы прыроды.

— У музейнай калекцыі больш за сто найменняў раслін — багацце Рагачоўскай зямлі, — кажа збароўская траўніца. — Ніводзін наведвальнік не пакіне нашу вёску, не паспытаўшы нашых гаючых напояў, не ўзбагаціўшыся ведамі пра культуру спажывання лекавых раслін.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Падзея

«КАСМІЧНЫ ДЭСАНТ» ВЫСАДЗІЦЦА Ў БЕЛАРУСКАЙ СТАЛІЦЫ

Каля 90 касманаўтаў прымуць удзел у 31-м міжнародным кангрэсе Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў у Мінску. Кангрэс пройдзе ў беларускай сталіцы з 9 па 15 верасня. Агульная колькасць яго ўдзельнікаў — больш як 200 спецыялістаў з 19 краін: Германіі, Нідэрландаў, Швецыі, Аўстрыі, Кітая і іншых.

— Самымі прадстаўнічымі будуць дэлегацыі з Расіі і ЗША, — расказаў журналістам **намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей КІЛІН.** — Мы чакаем у госці першага кітайскага касманаўта Яна Лівэя, першую жанчыну-касманаўта, якая выйшла ў адкрыты космас, — Святлану Савіцкую, Сяргея Крыкалёва — касманаўта, які правёў у касмічных камандзіроўках увогуле практычна тры гады свайго жыцця (803 дні). Кангрэс наведае і легендарны савецкі касманаўт Віктар Савіных. Палёт Уладзіміра Джанібекава і Віктара Савіных стаў адной з самых складаных місій у гісторыі сусветнай касманаўтыкі. Перад імі стаяла задача — прыстыкавацца ўручную да некіраванага «Салюта-7» і рэанімаваць касмічную станцыю пасля адключэння энергасістэмы. Іх подзвіг быў пакладзены ў аснову аднайменнага мастацкага фільма.

Асацыяцыя ўдзельнікаў касмічных палётаў у Мінску (АУКП) — міжнародная некамерцыйная арганізацыя, якая аб'ядноўвае касманаўтаў з многіх краін. Яна была створана больш як 30 гадоў таму для абмену вопытам у галіне пілатаваных касмічных палётаў. Міжнародны кангрэс АУКП збірае штогод касманаўтаў, прадстаўнікоў навукова-даследчых устаноў і нацыянальных касмічных агенцтваў. Напрыклад, у Мінску запланаваны чатыры тэхнічныя сесіі, падчас кангрэса будуць заслуханы таксама справаздачы касманаўтаў, якія пабывалі за апошні год на Міжнароднай касмічнай станцыі.

СТАР. 3

■ Хутка ў школу

«ЗРАБІЛІ ПА-СУЧАСНАМУ»

Як невялікая вясковая школа рыхтуецца да новага навучальнага года

Ужо праз некалькі дзён у школах пачнуцца ўрокі. Дзеці вяртаюцца з марскіх падарожжаў, нясуць з бібліятэк падручнікі, прымяраюць новую форму. А як у навучальных установах рыхтуюцца прыняць хлопчыкаў і дзяўчатак? Мы заехалі ў вясковую школу ў Пяршаях — самую старую ў Валожынскім раёне (сёлета ёй спаўняцца 150 гадоў) — і паглядзелі, як там праходзяць апошнія летнія дні.

Абноўленая спартзала і яблычнае варэнне

— У гэтым годзе ў нас няма 11 класа, — расказвае **дырэктар Пяршайскага дзіцячага садка-сярэдняй школы Святлана ЛАМАКА.** — Усе пайшлі: хто ў Навапольскі аграрна-эканамічны каледж на праграміста, хто ў Мінск — на аўтаслесара ці энергетыка.

СТАР. 4

■ Ва ўрадзе

ЯШЧЭ РАЗ ПРА ЗАРОБКІ

На пасяджэнні Савета Міністраў, якое адбылося ўчора, абмеркавалі бюджэт на наступны год, а таксама праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця і асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі. Як адзначыў прэм'ер-міністр Сяргей Румас, гэта сустрэча — заключны элемент першага этапу фарміравання пакета прагнозных дакументаў перад накіраваннем іх на разгляд кіраўніка дзяржавы.

Сяргей Румас таксама звярнуў увагу, што на сёння дасягнутае разуменне па ўсіх ключавых пытаннях. Прынцыповым застаецца забеспячэнне выканання параметраў пяцігадовай праграмы. У дакладзе міністра эканомікі кіраўнік урада папрасіў паведаміць пра «вузкія месцы» ў вырашэнні гэтай задачы.

«Крытэрыем ацэнкі эфектыўнасці старшынь гар- і райвыканкамаў з'яўляецца стварэнне новых рабочых месцаў», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Ён папрасіў губернатараў арганізаваць працу з кіраўніцтвам выканкамаў на гэтым узроўні, як таго і патрабуюць пэўныя дакументы.

Акрамя таго, кіраўнік Савета Міністраў звярнуў увагу, што прынцыповае патрабаванне па збалансаванасці рэспубліканскага бюджэту захоўваецца. Расходы не павінны перавышаць даходы.

Што датычыцца Міністэрства фінансаў, Сяргей Румас адзначыў: «Прашу ў дакладзе акцэнтаваць увагу на асноўныя напрамкі расходаў бюджэту з улікам патрабаванняў кіраўніка дзяржавы аб 10-працэнтным скарачэнні расходаў на дзяржаўную падтрымку рэальнага сектара з прапарцыянальным павелічэннем фінансавання сацыяльнай сферы. Нагадаю, што ўрад на 2019 год паставіў для сябе мэтавую задачу — дабіцца ўзроўню заработнай платы ў бюджэтнай сферы не меншага за 80 % сярэдняй заработнай платы па краіне. Памер пенсіі па ўзросце павінен быць не ніжэйшы за 40 % ад сярэдняй заработнай платы».

Міністр эканомікі Дзмітрый Крутой пракаментаваў, што тэмп росту ВУП захаваны на ўзроўні 104 %. Каля 75 % гэтага прыросту чакаецца за кошт унутранага попыту і прыкладна 25 % — за кошт знешняга. «Вядома, спачатку мы планавалі, што доля экспарту будзе крыху вышэйшая. Але гэтыя знешнія ўмовы, якія змяніліся літаральна ў апошні месяц, вымусілі нас зрабіць пэўныя карэктывы», — растлумачыў міністр эканомікі.

— Асноўнымі драйверамі нашага росту застануцца налета інвестыцыі і экспарт. Мы свядома павялічылі тэмпы па інвестыцыях прыкладна ў два разы ў параўнанні з тэмпамі ВУП на ўзроўні 109,5 %. Гэта цяжкае заданне для нашых суб'ектаў гаспадарання, але па той рабоце, якую мы ўжо правялі, відаць, што 28 мільярдаў рублёў, якія мы запланавалі прыцягнуць у якасці інвестыцый у наступным годзе, цалкам рэальныя. І па крыніцах на сёння мы бачым ужо 80-працэнтнае напаўненне гэтага задання. 671 праект ужо пацверджаны, гэта значыць інвестыцыі стануць вельмі сур'ёзным драйверам на нашым унутраным рынку, — паведаміў Дзмітрый Крутой.

Што датычыцца паслуг, тэмп экспарту плануюць на ўзроўні 107,6 %. Пры гэтым ключавыя паслугі, такія як IT, інфармацыйныя, турыстычныя, будуць расці з тэмпам 112 %. Агульны прырост па гэтым сектары прыкладна 700 мільёнаў долараў. І ўпершыню агульная валютная выручка ад гэтага сегмента дасягне ўзроўню 9,7 мільярда долараў. На думку міністра, транспартныя, лагістычныя і IT-паслугі становяцца для беларускай эканомікі тымі «нафтай і газам», якіх у нас няма.

Таксама Дзмітрый Крутой паабяцаў: «У нас колькасць занятых у эканоміцы ўвогуле ў наступным годзе вырасце. Нягледзячы на адмоўны ўплыў дэмаграфічнага фактару, мы яго поўнасцю кампенсуем той пенсійнай рэформай, якая праводзіцца. І той прырост на 9-10 тысяч чалавек у цэлым будзе забяспечаны толькі за кошт эканамічнага фактару — тых новых інвестыцыйных праектаў, якія будуць рэалізоўвацца, і стварэння новых рабочых месцаў».

Сяргей Калечыц, намеснік старшыні праўлення Нацбанка, расказаў: «Мы разлічваем стрымаць інфляцыю ў межах 5 % (на снежань у адносінах да снежня папярэдняга года). Для гэтага мы будзем працаваць у рэжыме манетарнага таргетавання, гэта значыць ажыццяўляць кантроль за шырокай грашовай масай, працягнецца паступовае зніжэнне ўзроўню працэнтных ставак па меры магчымасці. Курсавая палітыка па-ранейшаму захавае дастатковую гнуткасць, каб своечасова рэагаваць на тыя знешнія шокі, якія мы часам адсочваем. Захаваецца задача нарошчвання золатавалютных рэзерваў».

Надзея АНІСОВІЧ

■ Парламенцкі дзённік

ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У ПРАГРЭСЕ

Беларусь настроена на больш актыўнае развіццё прамысловай кааперацыі з В'етнамам

Аб гэтым заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Беларусі Ле Анем, які завяршае дыпламатычную місію ў нашай краіне.

Дарэчы, па прамысловай кааперацыі ўжо рэалізоўваецца шэраг праектаў. Напрыклад, сёлета — зборка грузавых аўтамабіляў МАЗ, пасажырскіх аўтобусаў. Ёсць праект па харчовай прамысловасці, ствараецца сумеснае прадпрыемства па перапрацоўцы сухога малака і сухой малочнай сыроваткі — яно павінна пачаць працаваць у канцы года.

Вялікія надзеі Беларусь ускладае на 16-ю міжнародную выстаўку, якая пройдзе ў в'етнамскім горадзе Хашымін у пачатку снежня. Каля 25 айчынных прадпрыемстваў ужо заявілі, што прымуць актыўны ўдзел у гэтым мерапрыемстве. Сярод іх — МТЗ, МАЗ, БелАЗ, «Камунарка» і іншыя.

Па словах спікера ніжняй палаты парламента, за час працы Ле Аня адносіны паміж нашымі дзяржавамі набылі больш глыбокі і змястоўны характар. Вялікі ўклад у такі стан спраў быў унесены за кошт узроўню адносін прэзідэнтаў дзвюх дзяржаў. Нагадаем, у мінулым годзе адбыўся візіт кіраўніка В'етнама ў Беларусь, які надаў сур'ёзны стымул рабоце міжурадавай камісіі, міністэрстваў і ведамстваў. Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама дадаў, што візіт станоўча адбіўся і на міжпарламенцкіх кантактах, бо тады была дасягнута дамоўленасць аб візіце старшыні Нацыянальнага сходу В'етнама ў наступным годзе. Гэтая сустрэча дасць новыя магчымасці для супрацоўніцтва, перакананы Уладзімір Андрэйчанка.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў: за гэтыя гады створана салідная дагаворна-прававая база, рабочыя групы па супрацоўніцтве, адбываюцца візіты груп дружбы. Напярэдзе выкананне задачы, якую паставілі прэзідэнты дзвюх дзяржаў, — да канца 2019 года ўзаемны тавараабарот павінен дасягнуць адзнакі ў 500 мільёнаў долараў. «Рост ёсць, але гэтага яшчэ недастаткова для таго, каб выйсці на 500 мільёнаў долараў», — заўважыў спікер ніжняй палаты парламента.

Уладзімір Андрэйчанка падзякаваў Ле Аню за сумесную працу на карысць нашых парламентаў і краін.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

РАСІЯ ПРАВЯДЗЕ НАЙБУЙНЕЙШЫЯ ВУЧЭННІ

У верасні міністэрства абароны Расіі правядзе самыя маштабныя з 1981 года ваенныя вучэнні. Па звестках ведамства, у манеўрах пад назвай «Усход-2018» возьмуць удзел каля 300 тысяч вайскоўцаў. «Яны ў чымсьці паўтараюць «Захад-81», але ў чымсьці, мабыць, яшчэ больш маштабныя», — заявіў міністр абароны Сяргей Шайгу. Вучэнні «Усход-2018» пройдуць з 11 па 15 верасня амаль на ўсіх палігонах Цэнтральнай і Усходняй ваенных акруг. У іх будзе задзейнічана 36 тысяч адзінак сухапутнай тэхнікі, у тым ліку танкі, бронетранспарцёры і іншыя машыны, а таксама больш за тысячу самалётаў і верталётаў. У вучэннях возьмуць удзел войскі Усходняй і Цэнтральнай ваенных акруг, а таксама сілы Паўночнага і Ціхаакіянскага флоту і ПДВ. У якасці падрыхтоўчых мерапрыемстваў будзе каля 15 спецыяльных вучэнняў па забеспячэнні войскаў.

ЗША І МЕКСІКА ЗНАЙШЛІ ЗАМЕНУ NAFTA

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў аб дасягненні дамоўленасці з Мексікай па гандлі, якая прыйдзе на зменну Пагадненню аб паўночнаамерыканскай зоне свабоднага гандлю (NAFTA) і пойдзе на карысць абедзвюм краінам. Трамп заявіў, што назва пагаднення будзе зменена і растлумачыў гэта тым, што NAFTA выклікае «дрэнныя асацыяцыі». Аб'ява прагучала ў Авальным кабінеце Белага дома ў прысутнасці журналістаў. «Гэта выдатная здзелка. Мексіка паабяцала неадкладна пачаць закупляць як мага больш сельскагаспадарчай прадукцыі. І будзе працаваць у гэтым кірунку вельмі старанна», — заявіў Дональд Трамп. Мексіка імпартуе з ЗША больш свініны і кукурузы, чым любая іншая краіна ў свеце. У рамках новага гандлёвага пагаднення паміж ЗША і Мексікай вытворчасць аўтапрадукцыі ў абедзвюх краінах павінна вырасці з 63 да 75 працэнтаў. Прэм'ер-міністр Канады Джасцін Трудо ў размове з прэзідэнтам Мексікі Энрыке Пеньем Ньета пагадзіўся з трохбаковым характарам здзелкі NAFTA. У сваю чаргу афіцыйны прадстаўнік МЗС Канады Адам Осцін, каментуючы магчымасць далучэння Атавы, заявіў, што «краіна заключыць гандлёвае пагадненне з ЗША толькі на выгадных для сябе ўмовах».

18 ЧАЛАВЕК ПАЦЯРПЕЛІ ПАДЧАС ПРАТЭСТАЎ У НЯМЕЦКІМ ХЕМНІЦЫ

Па даных паліцыі, 591 яе супрацоўнік прысутнічаў для гарантавання бяспекі на дзвюх дэманстрацыях, якія адбыліся ў цэнтры Хемніца. Гаворка ідзе пра акцыі партыі «Левыя», а таксама правага грамадзянскага руху «Pro Chemnitz», у якіх узялі ўдзел каля 8 тысяч чалавек. «Падчас абедзвюх дэманстрацый адбыліся сутыкненні, у выніку якіх, па папярэдніх даных, пацярпелі 18 удзельнікаў акцый і двое паліцэйскіх», — адзначаецца ў прэс-рэлізе паліцыі. Як вядома, у саксонскім Хемніцы на ўсходзе Германіі ў ноч на нядзелю адбылася бойка, у якой загінуў 35-гадовы немец. Падазраванымі па справе аб забойстве праходзяць 23-гадовы грамадзянін Сірыі і 22-гадовы грамадзянін Ірака. Адміністрацыйны суд Хемніца выдаў ордэр на іх арышт.

НАВУКОЎЦЫ ВЫСВЕТЛІЛІ, АБ ЯКІХ ПРАБЛЕМАХ СА ЗДАРОЎЕМ СВЕДЧАЦЬ МАРШЧЫНЫ

Маршчыны могуць быць індыкатарам павышанай рызыкі смерці ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, высветлілі французскія даследчыкі з Тулузскага ўніверсітэта. Пра гэта яны расказалі на штогадовай канферэнцыі Еўрапейскага таварыства кардыёлагаў у Мюнхене. Удзельнікамі даследавання сталі 3200 чалавек, узрост якіх на момант пачатку эксперымента складаў 32, 42, 52 і 62 гады. Навукоўцы ацанілі іх маршчыны на лбе па шкале ад нуля да трох у залежнасці ад іх выяўленасці. За добраахвотнікамі назіралі на працягу 20 гадоў. За гэты час 233 з іх памерлі. Як аказалася, чым глыбейшыя былі маршчыны, тым больш магчымай аказалася смерць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў. «Мы звярнулі ўвагу на маршчыны ў якасці маркера, таму што гэта проста і наглядна, — заўважыла вядучы аўтар даследавання Іаланда Эскіроль. — Толькі зірнуўшы на твар чалавека, можна даць яму парады па зніжэнні рызыкі развіцця захворванняў».

■ Экспарт

ПРАВЯРАЙЦЕ І КУПЛЯЙЦЕ

Перспектывы пашырэння паставак беларускай прадукцыі харчавання на рынак Еўрапейскага саюза абмеркавалі на сустрэчы віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы і еўракамісар па пытаннях аховы здароўя і бяспекі харчовых прадуктаў Віцяніс Андрукайціс. Дэлегацыя Еўрасаюза ў гэтыя дні наведвае Беларусь.

Беларусь зацікаўлена хутчэй сертыфікаваць свае птушкафабрыкі, каб атрымаць магчымасць экспарту мяса ў Еўрапейскі саюз, і скрупулёзна вырашае пытанні, пастаўленыя партнёрамі, запэўніў намеснік прэм'ер-міністра. Еўрапейскія спецыялісты ўжо некалькі разоў аглядалі беларускія прадпрыемствы, якія маюць намер ажыццяўляць пастаўкі на рынак ЕС. Павысіць тавараабарот магчыма за кошт пашырэння спіса прадукцыі, дазволенай на ўвоз у Еўрапейскі саюз.

«Мы адкрытыя і гатовыя вырашаць многія пытанні, якія ставяцца Еўрасаюзам, у тым ліку па афрыканскай чуме свіней і іншых напрамках», — цытуе словы Міхаіла Русага БелТА.

Віцяніс Андрукайціс падкрэсліў неабходнасць абмену інфармацыяй па назіранні за станам захворванняў жывёл і супрацоўніцтва па дыягностыцы такіх захворванняў.

Актуальныя тэмы ўзаемадзеяння з Еўрапейскім саюзам абмяркоўвалі і ў Міністэрстве замежных спраў, дзе з еўракамісарам сустрэўся намеснік міністра Алег Краўчанка. З беларускага боку ў перагаворах удзельнічалі намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання — дырэктар Дэпартамента ветэрынарнага нагляду Іван Смільгінь і намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Наталля Жукава.

Праграма візіту камісара ўключае наведванне рэгіёнаў. Віцяніс Андрукайціс пазнаёміцца з ажыццяўленнем праекта ў Навагрудку, які рэалізуецца на сродкі ЕС, а таксама наведае Літоўскі цэнтр адукацыі, культуры і інфармацыі ў Рымдзюнах.

Марыя ДАДАЛКА

■ Бяспека працы

ТРАЎМАЎ НА ВЫТВОРЧАСЦІ СТАЛА БОЛЬШ

Асабліва ў Брэсцкай вобласці

Нягледзячы на меры, якія прымаюцца, стан вытворчага траўматызму з цяжкімі наступствамі пагоршыўся. Так, па аператыўных даных Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы, за студзень — чэрвень гэтага года ў выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці загінула 70 работнікаў, што на 12 чалавек больш, чым за аналагічны перыяд летась. Яшчэ 343 атрымалі цяжкія траўмы (у першым паўгоддзі 2017-га — 276).

Асабліва паказчык вытворчага траўматызму вырас у арганізацыях Брэсцкай вобласці: калі ў студзені — чэрвені мінулага года там загінула сем работнікаў, то за гэты ж перыяд сёлета — 18.

Высокі ўзровень няшчасных выпадкаў на прыватных прадпрыемствах звязаны з нездавальняючай работай па ахове працы і ў многім безадказным стаўленнем кіраўніцтва да стварэння бяспечных умоў. У гэтых арганізацыях віна наймальніка была ў 59 працэнтах выпадкаў з цяжкімі наступствамі, у той час калі ў цэлым па краіне гэты паказчык складае 48 працэнтаў.

Але найбольш загінулых і траўмаваных на вытворчасці аказалася ў арганізацыях камунальнай формы ўласнасці. Палова пацярпелых з цяжкімі наступствамі — работнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Таксама значна выросла колькасць няшчасных выпадкаў у будаўнічай галіне. Высокай застаецца ўдзельная вага траўмаў пры ДТЗ.

Сярэдні ўзрост загінулых на вытворчасці ў першым паўгоддзі склаў 46 гадоў, пацярпелых з цяжкімі траўмамі — 44 гады. Найбольшую ўдзельную вагу (амаль траціну) сярод загінулых займаюць работнікі ва ўзросце ад 41 да 50 гадоў, а сярод траўмаваных — ад 51 да 60 гадоў.

Маніторынг паказаў, што асноўным траўмуючым фактарам было ўздзеянне прадметаў і дэталяў, якія рухаюцца, разлятаюцца і круцяцца (праз гэта адбыўся кожны чацвёрты няшчасны выпадак са смяротным зыходам). Людзі часцей сталі гінуць на рабочым месцы ў выніку падзення ці абвальвання канструкцый будынкаў, ДТЗ, падзення з вышыні, пажару, уздзеяння шкодных рэчываў і ўтаплення.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

■ Фінансавы выдатнік

ПАЕЗДКА Ў ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ

У апошнія выхадныя лета стартаваў праект Белінвестбанка па развіцці фінансавай адукаванасці сярод навучэнцаў пачатковых класаў «Фінансавы экспрэс».

Юныя мінчане, а таксама госці сталіцы змаглі сумясціць падарожжа па Дзіцячай чыгунцы і ўрок аб фінансах, прыняць удзел у конкурсах і віктарынах і атрымаць прызы за сваю кемлівасць і веды. Акрамя таго, падчас паездкі дзецям прапанавалі «прымераць» на сябе бацькоўскую адказнасць, паразважаць пра грошы і пра тое, як імі правільна распараджацца.

У спецыяльным вагоне цягніка юныя пасажыры даведаліся пра гісторыю ўзнікнення грошай і прынялі ўдзел у інтэрактыве, прысвечаным сучасным плацежным інструментам. Праваднікамі вагона выступілі супрацоўнікі банка. Яны растлумачылі, чаму трэба быць фінансава адукаваным, для чаго працуюць банкі, як навучыцца прымнажаць свае зберажэнні, якія магчымасці дае банкаўская картка, хто і чаму размешчаны на грашовых купюрах.

Дзеці з уласцівай ім непасрэднасцю ўключыліся ў абмеркаванне складаных пытанняў. А падчас віктарыны наперабой выкрыквалі свае здагадкі і вельмі радаваліся, даўшы правільны адказ. Пасля насычанай праграмы ў вагоне цягніка на пероне падарожнікаў сустракаў хамяк Засек. Ён уручыў кожнаму ўдзельніку паветраны шар і кнігу «Дзеці і грошы». А пераможцаў інтэрактыву чакалі спецыяльныя прызы і медалі, якія яны атрымалі з рук **намесніка старшыні праўлення Белінвестбанка Аляксандра ФІЛІПОВІЧА.** Топменеджар банка ўпэўнены, што дзякуючы такім мерапрыемствам у дзяцей фарміруецца навык кіравання грашыма, разуменне іх сутнасці.

Сяргей КУРКАЧ

■ Будзь у курсе!

Падручнікі — па адной цане для ўсіх

Пастановай урада ад 28 жніўня № 621 падыходы да аплаты за карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі былі зменены.

Згодна з дакументам, размешчаным на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, цяпер яна складзе 0,2 базавай велічыні — пры засваенні зместу адукацыйных праграм дашкольнай адукацыі (раней — у памеры іх кошту), і 0,5 базавай велічыні — пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі за I—XI класы. Нагадаем, што раней бацькі школьнікаў аплачвалі 50 працэнтаў ад кошту адпаведных камплектаў падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, прычым цэны на падручнікі маглі істотна адрозніваца ў розных класах.

Установленая плата за карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі ўносіцца да 1 кастрычніка бягучага года законнымі прадстаўнікамі навучэнцаў.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Канікулы

ДА ПАБАЧЭННЯ, ЛЕТНІК!

Паўтысячы дзяцей з Сірыі, 300 — з Кітая і 120 — з Японіі прайшлі аздараўленне ў нашай краіне.

Акрамя гэтага, у межах летняй кампаніі ў дзіцячых лагерах адпачылі 381 тысяча юных беларусаў, а гэта больш за трэць ад усіх дзяцей ва ўзросце 6—18 гадоў. Кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Ларыса Емяльянчык адзначае, што ў апошнія гады колькасць дзяцей, якія праходзяць аздараўленне ў лагерах, стабільна складае 32—34 %.

Летам у нашай краіне працавала 6172 дзіцячыя лагеры, у тым ліку 1553 — кругласутачныя (апошнія прынялі 160,5 тысячы дзяцей). У падлеткаў 14—18 гадоў была магчымасць не толькі адпачыць, але і зарабіць. Такой магчымасцю ў лагерах працы і адпачынку скарысталася 13,5 тысячы чалавек. Паводле інфармацыі Ларысы Емяльянчык, падлеткі займаліся добраўпарадкаваннем школьных тэрыторый і рамонтам мэблі, праполкай сельскагаспадарчых культур і лясных саджанцаў, шылі пасцельную бялізну, сурвэткі і абрусы. І зарабілі ад 80 да 250 рублёў. З кожным годам у выхаваўча-аздараўленчых установах пашыраецца безбар'ернае асяроддзе, і сёлета ў лагерах адпачылі 3,5 тысячы дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

Штогод каля 16 тысяч дзяцей прымае нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня», які, дарэчы, налета адзначыць свой паўвекавы юбілей. Гэтым летам ён працаваў з максімальнай нагрузкай — прымаў па 1200 чалавек за змену. Менавіта тут адпачывалі дзеці з Сірыі, Японіі і Кітая. Для іх была падрыхтавана адмысловая праграма знаёмства з Беларуссю, у прыватнасці, замежныя госці наведалі Мірскі і Нясвіжскі замкі, пабывалі ў Вялікім тэатры оперы і балета, пазнаёміліся з беларускай кухняй. Усяго ж у «Зубраняці» адпачылі дзеці з 45 краін.

Маленькія беларусы таксама выязджаюць на аздараўленне за мяжу па праграмах міжнародных фондаў. Сёлета каля 18 тысяч дзяцей са шматдзетных сем'яў, сірот, выхаванцаў інтэрнатаў і дзяцей, якія пражываюць на тэрыторыях, забруджаных пасля Чарнобыльскай катастрофы, пабывалі ў Італіі, Вялікабрытаніі, Іспаніі, Ірландыі і іншых краінах.

Алена КРАВЕЦ

«КАСМІЧНЫ ДЭСАНТ» ВЫСАДЗІЦЦА Ў БЕЛАРУСКАЙ СТАЛІЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Правядзенне міжнароднага кангрэса ў Мінску — добры спосаб нагадаць усім пра Беларусь як пра касмічную дзяржаву, — падкрэсліў Сяргей Кілін. — На кангрэсе будуць абмяркоўвацца расійскія касмічныя праграмы, праграмы NASA, нацэленыя на аднаўленне даследаванняў Месяца, стварэнне месяцовай арбітальнай станцыі, палёт на Марс, а таксама праекты па падрыхтоўцы чалавека да працяглых палётаў. Дарэчы, беларусам было прапанавана ўдзельнічаць у праекце SIRIUS са сваімі заданнямі і, магчыма, наш чалавек будзе ўключаны ў эксперыменты па знаходжанні ва ўмовах працяглай ізаляцыі ў абстаноўцы, якая мадэлюе абстаноўку на касмічным караблі.

Сяргей Кілін падкрэсліў, што сёння цэлы пласт эканамічных праблем вырашаецца толькі з дапамогай касмічных тэхналогій: ад маніторынгу надзвычайных сітуацый і забеспячэння мабільнай сувязі да будаўніцтва дарог і кантролю за эпідэміямі.

Шмат увагі падчас кангрэса будзе прысвечана папулярызацыі касмічных праграм і даследаванняў сярод моладзі, бо сёння мала хто з падрастаючага пакалення цікавіцца космасам — мода прайшла... Будзе арганізаваны шэраг сустрэч касманаўтаў са школьнікамі і студэнцкай моладдзю. У Мінск для гэтага прыедуць прадстаўнікі з усіх абласцей. Таксама ў Цэнтральным батанічным садзе будзе закладзена алея касманаўтаў, а на вуліцы Касманаўтаў у Мінску адкрыецца памятны знак «Беларусам — героям космасу» работы скульптара Івана Міско.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Чулі?

Трактарыст — каратыст

73-гадовы пенсіянер адной левай справіўся з рэцыдывістам

Як паведамілі ва УУС Віцебскага аблвыканкама, Юзаф Каласёнак, калі вярнуўся з пакосу дадому, убачыў, што адно з вокнаў разбіта. Каб даведацца, што здарылася, ён прайшоў на кухню. Там нейкі незнаёмы мужчына складваў у сумку маёмасць пенсіянера. Здагадаўшыся, што гэта злодзей, стары не стаў марудзіць і адным ударам левай рукі адправіў нязванага госця ў глыбокі накаўт. Пасля чаго звязаў яго, выклікаў міліцыю і крыху пазней перадаў прадстаўнікам закону.

Затрыманым аказаўся 55-гадовы дамушнік, які меў багатую крымінальную біяграфію. Ужо ў міліцыі ён скардзіўся на тое, што пенсіянер аглушыў яго лапатай, і грозіўся нават падаць скаргу. Але Юзаф Часлававіч сказаў, што наносіў удар кулаком. А сваю зайздросную фізічную форму растлумачыў тым, што 40 гадоў адпрацаваў у сельскай гаспадарцы на гусенічным трактары, ды і на пенсіі не прывык сядзець без справы.

Сяргей КУЛАКОЎ

■ Здарэнні

«ЧАРОЎНЫ» ЗАПЛЕЧНІК

Ён стаў прычынай многіх «прыгод»

У Ленінскае РУУС сталіцы звярнулася 48-гадовая жыхарка раёна, якая паведаміла аб крадзяжы з яе кватэры невядомым мужчынам заплечніка, што належаў сыну.

Міліцыянеры неўзабаве ўстанавілі, што да крадзяжу маёмасці датычны 38-гадовы жыхар Серабранкі. Што цікава, мужчына вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі літаральна за два дні да здзяйснення названага злачынства. Далей — не менш займальная гісторыя.

Падчас разбору сітуацыі высветлілася, што падазраваны шляхам свабоднага доступу (чытай — праз незачыненыя дзверы) трапіў у кватэру пацярпелага і скраў заплечнік з маёмасцю. На гэты момант у жыллі была маці апошняга, але жанчына... не ўдзяляла ўвагі шуму адчыненых дзвярэй, бо вырашыла, што дадому вярнуўся сын. Зламыснік выйшаў з пад'езда і адразу натрапіў на... уладальніка заплечніка. Той, вядома, пазнаў сваю маёмасць і ўтрымліваў злодзея да прыбыцця міліцыянераў.

Па інфармацыі Ленінскага РУУС г. Мінска, цяпер падазраванаму могуць прысудзіць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да чатырох гадоў.

Загінуў ад сваіх «жыгулёў»

Прычынай стала сутыкненне з грузавіком

Здарэнне адбылося ўвечары на 116-м кіламетры трасы Мінск — Магілёў каля вёскі Пагост у Бярэзінскім раёне. «Жыгулі» стаялі на ўзбочыне, іх 64-гадовы кіроўца разам са сваім 17-гадовым сынам выпраўляў у машыне тэхнічныя непаладкі. У гэты момант 25-гадовы мінчанін, кіруючы грузавым фургонам «Мерседэс Бенц», наехаў на легкавік. Той ад удару пакаціўся і наехаў на кіроўцу. Па інфармацыі УСК па Мінскай вобласці, у выніку ўладальнік «жыгулёў» атрымаў траўмы, ад якіх сканаў у бальніцы.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Разумныя грошы

КАРТКА З ДАЛОНЬКАЙ

Кішэнныя сродкі ў малых лепш кантраляваць

Што такое прэміум-сегменты ў банкаўскіх картках, чаму дзіцячая картка лепш за наяўныя і ці ёсць будучыня ў банкаўскага пластыку, расказвае дырэктар электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслаў СЕНІН.

Кэшбэк на выбар

Самыя папулярныя — дэбетавыя зарплатныя карткі. Гэты вектар будзе захоўвацца, лічыць наш суразмоўнік. Сюды можна аднесці і дэбетавыя студэнцкія або пенсійныя карткі. Сярод так званых крэдытных картак у нашай краіне сёння папулярныя карты растэрміноўкі. У цяперашні час некаторыя банкі выдаюць карткі да адзыўных дэпазітаў. Такім чынам, кліенты могуць папоўніць дэпазіт (праз АРІП) або зняць частку ўкладу ў банкамаце, выкарыстоўваючы картку і без наведвання аддзялення банка.

Таксама папулярнасць набірае такая функцыя, як кэшбэк або манібэк, калі пэўны працэнт ад куплі вяртаецца ўладальніку рахунку. Банкі актыўна ўкараняюць карткі з кэшбэкам. Пры гэтым павялічваецца прадуктовая лінейка такіх картак: першапачаткова банкі прапаноўвалі фіксаваную стаўку кэшбэка і самі вызначалі магчымасць атрымання павышанай такой опцыі. Цяпер жа ёсць карткі з кэшбэкам для пэўных сацыяльных груп. Некаторыя банкі даюць трымальнікам такога «пластыку» магчымасць самастойна выбраць катэгорыю тавараў для налічэння павышанага кэшбэку і нават змяняць такія катэгорыі.

Прэміум-сегмент: ці патрэбны ўсім?

Статус прэміяльнай карткі дазваляе яе ўладальніку атрымаць розны набор паслуг і банкаўскіх сэрвісаў, які дае дадатковы камфорт. Ну, напрыклад, паслуга кансьерж-сэрвіс. У трымальніка такой карткі можа быць персанальны менеджар банка, які вам можа забраніраваць столік у рэстаране або арганізаваць дастаўку букета кветак. Або такая прэміяльная картка дазваляе атрымліваць павышаную стаўку па ўкладзе або паніжаную — па авердрафце. Або атрымліваць разнастайныя страхоўкі, напрыклад пры выездзе за мяжу, праграмы зніжак, падоўжаную гарантыю на пакупкі, медыцынскую і юрыдычную дапамогу за мяжой.

Такая картка можа даваць сэрвіс доступу ў VIP-залы чакання аэрапортаў... Спіс такі вельмі доўгі і напаўненне прэміяльных картак можа быць цалкам розным у розных банкаў. Безумоўна, што чым больш «плюшак» у такой карткі, тым больш высокай можа быць яе цана.

Статус «прэміяльная» сведчыць, што такая картка павінна быць даступная не ўсім ахвотным, але сёння рынак банкаўскага «пластыку» тыпу «голд» даступны любому, былі б грошы. «Прэміяльны» статус такой карткі па вялікім рахунку часцей за ўсё будзе заключацца ў яе вонкавым выглядзе, лепшых умовах авердрафту, лімітаў і можа быць яшчэ чаго-небудзь нязначнага. У любым выпадку, якую картку насіць у кашальку, вырашае кожны трымальнік асабіста.

Аб фінансах для дзяцей

Мы ўсё часцей выдаём дзецям кішэнныя грошы не наяўнымі, а банкаўскай карткай. Спецыяльныя карткі для дзяцей ад 6 да 18 гадоў у нашай краіне з'явіліся некалькі гадоў таму, і з таго часу іх эмісія ўпэўнена расце. У цяперашні час дзіцячыя карткі (плацежных сістэм БЕЛКАРТ, Visa і MasterCard) выпускаюць ужо некалькі беларускіх банкаў. Напрыклад, Беларусбанк, Белаграпрамбанк, Белінвестбанк, Альфа-Банк, Тэхнабанк і іншыя.

Доля БЕЛКАРТ «Дзіцячая» ў агульным аб'ёме дзіцячых картак у Беларусі складае больш за 80 %.

Дзіцячыя карткі як правіла выпускаюцца ў якасці дадатковага плацежнага сродку бацькоў. У БЕЛКАРТ такія карткі пазначаныя спецыяльным знакам у выглядзе дзіцячай далонькі. З дапамогай гэтага віртуальнага кашалька дзеці старэйшыя за шэсць гадоў атрымліваюць магчымасць самастойна здзяйсняць безнаяўныя плацяжы, а бацькам пасля кожнай аперацыі прыходзіць sms з інфармацыяй, дзе і што купіла іх дзіця. Пры гэтым можна лёгка перавесці неабходную суму на картку нават на адлегласці. Згадзіцеся, у выпадку з наяўнымі кантраляваць выдаткі дзяцей значна больш складана.

Ёсць яшчэ адзін вельмі цікавы дзіцячы прадукт у выглядзе банкаўскай карткі ад айчыннай плацежнай сістэмы і Беларусбанка — гэта «Картка навучэнца». Такая картка спалучае ў сабе функцыі банкаўскага «пластыку» і іншых сэрвісаў. Напрыклад, картка замяняе сабой даведку пра бясплатны праезд у грамадскім транспарце, з'яўляецца пропускам для праходу праз школьную электронную сістэму і мае функцыю білета чытача ў бібліятэцы. Картка навучэнца выдаецца ў сталічных школах, якія абсталяваны спецыяльнай электроннай прапускной сістэмай. Сёння такімі карткамі карыстаюцца нават не ўсе школьнікі ў Мінску, але ў будучыні плануецца забяспечыць імі вучняў усіх школ краіны.

І яшчэ. Кожнаму з бацькоў важна памятаць, што адзін з прынцыпаў работы «дзіцячага» пластыку — давярай, але правярай. Уладальнік рахунку (бацькі або апякун дзіцяці), да якога выпушчана дзіцячая картка, можа аператыўна вызначаць і мяняць на ёй ліміты сродкаў.

Акрамя стандартных лімітаў на суму грашовых сродкаў і колькасць банкаўскіх аперацый за пэўны прамежак часу, можна кіраваць відамі і тыпамі транзакцый. Бацькі могуць устанавіць абмежаванні на зняцце наяўных і правядзенне безнаяўных плацяжоў, у тым ліку ў сеціве інтэрнэт. Шэраг банкаў дае магчымасць таксама кантраляваць пералік крамаў і службаў сэрвісу, дзе дзіцяці дазволена выкарыстоўваць сваю картку. Напрыклад, забараніць разлікі дзіцячай карткай у клубах і казіно, але дазволіць праводзіць аплату ў краме і пры куплі праязнога.

Пластык ці бранзалет?

Якія асноўныя тэндэнцыі на сусветным фінансавым рынку? Калі мы гаворым пра Беларусь, то, безумоўна, будучыня ў банкаўскага пластыку ёсць, лічыць наш спікер. Але...

Глабальная камп'ютарызацыя і інтэрнэтызацыя насельніцтва планеты прыводзіць да відавочнага эвалюцыйнага тэхналагічнага прагрэсу, з'яўляюцца розныя віртуальныя карткі і нават валюты разліку, напрыклад, крыптавалюта. Лёс такіх тэхналагічных навінак прадказаць складана. Магчыма, гэта проста нейкія імгненныя рэчы, і пасля яны знікнуць або трансфармуюцца ў нешта яшчэ. А можа быць, пазней, яны стануць больш папулярныя і надзейна ўвойдуць у наша жыццё.

Сяргей КУРКАЧ

«ЗРАБІЛІ ПА-СУЧАСНАМУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У верасні ў навучальную ўстанову пойдзе 85 школьнікаў і 25 выхаванцаў дзіцячага садка. 17 з іх на падвозе — «газель» забірае малых з вёсак Чэхаўшчына, Гуньбаўшчына, Канюшаўшчына, Папкі і Люцінка. Апошняя — самая дальняя, ад яе да Пяршаяў сем кіламетраў.

Дырэктар праводзіць па школе экскурсію:

— Два гады таму была магчымасць зрабіць у кабінетах рамонт за бюджэтныя грошы. Раней тут былі паклеены шпалеры — нават не верыцца. Цяпер зрабілі па-сучаснаму, пафарбавалі сцены. Замест старых шафаў паставілі стэлажы, куды настаўнікі кладуць свае метадычныя матэрыялы. Тут усё на віду — гэта дысцыплінуе трымаць парадак.

У многіх кабінетах ёсць камп'ютары і прынтары для работы. У камп'ютарным класе стаяць ноўтбукі і інтэрактыўная дошка.

Гэтым летам у будынку правялі касметычны рамонт. Пафарбавалі лесвіцы, падлогу ў спартыўнай зале.

— З шасці да васьмі вечара школа «грыміць», бо амаль усе дзеці ў спартзале. Гуляюць у валейбол, баскетбол, футбол. Зараз падлога прыгожая, а да канца навучальнага года ўся выцертая становіцца, — усміхаецца Святлана Леанідаўна.

Калі рамонт ляжыць на плячах тэхперсаналу, то даглядаць за прышкольнай тэрыторыяй дапамагаюць і настаўнікі. Уздоўж тратуараў высаджаны аксаміткі, далей у двары — яблыні. Садавіна не прападае — яблыкі сушаць, каб потым рабіць кампоты, ставяць варэнне (за гэта лета нарыхтавалі 40 літраў), каб дадаваць у булачкі.

Куток прыроды і рэчы Дуніна-Марцінкевіча

На першым уроку дзеці традыцыйна завітаюць у школьны музей. Ён быў адкрыты ў 1961 годзе тагачасным намеснікам дырэктара і мясцовым краязнаўцам Мікалаем Ганчарыкам. Тут сабрана больш за тры тысячы экспанатаў, якія паказваюць беларускую гісторыю ад першабытнага ладу да сучаснасці.

— Мікалай Ганчарык разам са сваімі вучнямі хадзіў па вёсцы ад хаты да хаты і збіраў па старажылах цікавыя рэчы: хто дыван тканы даваў, хто калаўрот. Ёсць нават унікальныя пасведчанні аб заканчэнні школы. Адно выдадзена ў 1912 годзе — у 100-годдзе з заканчэння вайны з французамі, другое ў 1913-м — да 300-годдзя дома Раманавых, — паказвае дакументы, упрыгожаныя памятнымі выявамі, цяперашні **кіраўнік музея, настаўнік гісторыі і геаграфіі Алена ШАПАВАЛ.**

Ёсць тут і экспазіцыя, прысвечаная Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. Пісьменнік хоць і нарадзіўся ў Бабруйскім раёне, але самыя вядомыя творы — «Пінская шляхта», «Гапон», «Вечарніца» — напісаў на Пяршайскай зямлі (яго фальварак знаходзіўся ў Люцінцы). У школе захоўваюцца рэчы, знойдзеныя пры раскопках на сядзібе класіка, — кафейнік, шкатулка ў выглядзе барана, фарфоравы кубак, рамка ад тэрмометра, кішэнны гадзіннік. Некалі сюды прыязджала нават праўнучка Дуніна-Марцінкевіча з Чыкага.

У музеі расказваецца таксама пра 14-гадовую піянерку Ядзю Трацэўскую, якая некалі тут вучылася. У 1943-м, калі мястэчка было акупавана немцамі і траіх партызан узялі ў палон, дзяўчынка разам са сваёй сяброўкай пракралася ўночы да турмы, збіла сякерай замок і выпусціла разведчыкаў. Нехта гэта бачыў, бо раніцай фашысты ўжо стукаліся ў дзверы да дзяўчат. Бацькам сказалі, што Ядзя і Міхаліна пойдуць мыць падлогу ў камендатуры, але назад іх не адпусцілі — расстралялі...

Яшчэ адна цікавінка гэтага музея — куток прыроды. У 1970-х Мінскі абласны краязнаўчы музей абнаўляў экспазіцыю, і школы маглі забраць сабе чучалы жывёл і птушак. Некалькі з іх і «прапісалася» ў Пяршаях.

Чаму мужчыну прасцей быць дырэктарам?

Дырэктар Святлана Ламака — сама выпускніца гэтай школы. З дзяцінства марыла стаць настаўнікам, як і яе тата. Выкладала спачатку ў малодшых класах, а шэсць гадоў таму ўзначаліла школу.

— Мае дзеці бачылі, што работа адымае ў мяне шмат часу, таму казалі — ні за што не пойдуць у настаўнікі, — успамінае жанчына. — Дачка працуе педыятрам у Валожынскай бальніцы, а сын вучыцца ў БНТУ.

Прызнаецца: мужчыну, напэўна, быць дырэктарам прасцей — ён да ўсяго стаіцца спакайней, не ўспрымае блізка да сэрца. Але не прываблівае іх гэта сфера — з усіх школ у раёне толькі дзве ўзначальваюць прадстаўнікі дужага полу.

Камп'ютарны клас з інтэрактыўнай дошкай.

Акрамя адміністрацыйнай работы, Святлана Леанідаўна вядзе ў 9 класе факультатыў «Мая прафесійная будучыня». «Расказваю дзецям, якія каледжы і ўніверсітэты ёсць — колькі там вучацца, як туды паступіць. Глядзім з імі фільмы пра розныя спецыяльнасці, бываем на прадпрыемствах з экскурсіямі. У гэтым узросце многія школьнікі яшчэ не ведаюць, кім хочуць быць. Некаторых да выбару пэўнай прафесіі схіляюць бацькі, але гэта няправільна, бо дзеці робяць памылкі і потым ім даводзіцца перапаступаць».

Часта выпускнікі школы ідуць у сельскую гаспадарку — па прыкладзе бацькоў. Дырэктару прыемна чытаць у газеце, як хлопцы, якія яшчэ нядаўна сядзелі за партамі, цяпер працуюць камбайнерамі і становяцца аднымі з найлепшых у раёне.

Ці складана вясковай школе канкурыраваць з гарадскімі? Святлана Леанідаўна задумваецца, пасля адказвае: гледзячы па чым меркаваць. Знайсці падыход да кожнага, дапамагчы раскрыць талент сельскім настаўнікам прасцей, бо дзяцей мала і ўсе на віду. А вось на алімпіядах перавагу маюць гарадскія школьнікі — магчыма, у іх больш падрыхтоўкі.

1 верасня для Святланы Леанідаўны заўсёды свята, і яна спадзяецца, што і дзяцей пасля канікулаў цягне ў школу. «Хацелася б, каб яны не страцілі інтарэсу да ведаў».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Валожынскі раён.

❍ Каментарый у тэму

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Віталь ЛІСОЎСКІ:

— З 1 верасня ў вобласці працягнуць работу 1204 установы адукацыі. Каля 12 тысяч дзяцей будуць на падвозе — для гэтага на балансе раённых упраўленняў адукацыі ёсць 252 аўтобусы. Яшчэ 16 цяпер закупляем.

Усяго бюджэтам Мінскай вобласці на падрыхтоўку да новага навучальнага года быў выдаткаваны 31 мільён рублёў. Гэтыя сродкі пайшлі на бягучы і капітальны рамонт, новае абсталяванне. Для школ набываем 25 камп'ютарных класаў і 25 лінгафонных (для вывучэння замежных моў) кабінетаў.

Па праграме развіцця сістэмы адукацыі за кошт сродкаў Сусветнага банка зрабілі бягучы рамонт у Крывіцкім дзіцячым садзе — сярэдняй школе (Мядзельскі раён) і Уздзенскай сярэдняй школе № 1.

У верасні адкрываецца таксама новы дзіцячы садок на 230 месцаў у Фаніпалі (Дзяржынскі раён) і сярэдняя школа на 720 месцаў у вёсцы Ляскоўка (Мінскі раён).

У гэтым годзе выдаткавалі сур'ёзнае фінансаванне на аснашчэнне прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі. Для іх набылі 25 адзінак вучэбнага абсталявання на суму 102,3 тысячы рублёў. Завяршаецца закупка 132 адзінак сучасных машын і абсталявання на суму 856,3 тысячы рублёў, 68 камп'ютарных класаў, лінгафонных кабінетаў і іншай тэхнікі на суму 132,4 тысячы рублёў.

ЦІ ЗАЎСЁДЫ КОЛЬКАСЦЬ ПЕРАХОДЗІЦЬ У ЯКАСЦЬ?



Фота БелТА.

ПЫТАННІ, ШТО СТАЯЦЬ НА ПАРАДКУ ДНЯ, СТАЛІЧНЫЯ ПЕДАГОГІ РАЗГЛЕДЗЕЛІ НА ФОРУМЕ

Ці можа колькасць школьных медалістаў, уладальнікаў стабальных сертыфікатаў ЦТ або пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных школьных алімпіяд быць аб'ектыўным крытэрыем ацэнкі якасці школьнай адукацыі? Калі зыходзіць з гэтых пазіцый, то сталічная сістэма адукацыі па-ранейшаму трымае сваю высокую марку. Але на жнівеньскім педагагічным форуме, што адбыўся ў Нацыянальнай бібліятэцы напярэдадні новага навучальнага года, размова ішла не толькі аб дасягненнях, а найперш аб праблемах і планах сістэмы адукацыі сталіцы на найбліжэйшую перспектыву.

У ПЕРШЫ КЛАС ЦІ ЗНОЎ У САДОК?

«Задача сённяшняга форуму — аб'ектыўна ацаніць існуючыя магчымасці і рэсурсы для ўдасканалення адукацыйнага працэсу», — падкрэсліла ў сваім выступленні **старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Марыя КІНДЗІРЭНКА.**

У сталіцы 9718 бацькоў першакласнікаў падалі заявы ва ўстанову адукацыі, за якой іх дом не замацаваны, і 14 463 сям'і — па месцы жыхарства.

Сёння ў Мінску функцыянуе больш як 755 установаў адукацыі ўсіх тыпаў. Іх сетка працягвае прырастаць разам з развіццём горада. У 2017 годзе ў сталіцы былі адкрыты чатыры дзіцячыя садкі і адна сярэдняя школа. Сёлета запланаваны ўвод яшчэ пяці дашкольных устаноў і адной школы на 1020 месцаў. Але тэмпы жыллёвага будаўніцтва па-ранейшаму апераджаюць развіццё адукацыйнай інфраструктуры.

— Некалькі гадоў таму мы прапаноўвалі вырашаць праблему забеспячэння месцамі ў садках «крокавай даступнасці» за кошт павелічэння праектнай магутнасці ўстаноў, якія будуюцца. На жаль, у Мінску гэтая ідэя пакуль не знайшла ўвасаблення, нягледзячы на тое, што была праведзена вялізная арганізацыйная работа, — канстатавала Марыя Кіндзірэнка. — Затое яна была рэалізаваная ў адным з рэгіёнаў, і ўжо ў верасні бягучага года ў Брэсце будзе адкрыты дзіцячы садок, разлічаны на 350 месцаў.

За кошт мабілізацыі ўнутраных рэсерваў — выведу першых класаў у школы і аднаўлення функцыянальнага прызначэння групавых памяшканняў — у мінулым навучальным годзе ў дзіцячых садках Мінска былі забяспечаны месцамі дадаткова 1220 дзяцей. З пэўнай доляй асцярожнасці можна казаць аб тым, што вастрыня праблемы забеспячэння месцамі ва ўстановах дашкольнай адукацыі паступова пачала змяншацца. Акрамя таго, упершыню за апошнія тры гады сярэдняя ўкамплектаванасць дзіцячых садкоў перастала павялічвацца.

Сур'ёзнай праблемай для горада з'яўляецца і вялікая колькасць дзяцей шасцігадовага ўзросту, якія яшчэ на адзін год застаюцца ў дзіцячым садку. «Гаворка ідзе пра бацькоў, якія пажадалі падоўжыць камфортнае знаходжанне свайго дзіцяці ў дашкольнай установе замест таго, каб прывесці яго ў першы клас, — удакладніла старшыня камітэта па адукацыі. — На пачатак мінулага навучальнага года не прыступілі да заняткаў 5184 дзіцяці, якім на 1 верасня ўжо споўнілася шэсць гадоў, а гэта на 526 больш, чым у папярэднім годзе. З іх па медыцынскіх паказаннях — толькі 6 %, а па рашэнні бацькоў — 72 %. На жаль, інтарэсы бацькоў аказваюцца мацнейшыя за нашы пераканаўчыя словы і аргументы. Праўда, над тым, наколькі яны пераканаўчыя, яшчэ трэба паразважаць...»

ХАЧУ БЫЦЬ ГІМНАЗІСТАМ...

У сувязі з новымі правіламі камплектавання пятых класаў гімназій Мінск сёння адчувае найбольшае напружанне ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі, бо кожная пятая ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі ў горадзе — гімназія, якая цяпер напаўняецца дзецьмі з замацаваных за гэтай установай дамоў.

З вясны ў сталіцы распачаўся, так бы мовіць, працэс перадзелу адукацыйнай прасторы. «Для кіраўнікоў гэта стала адначасова і кіраўніцкай задачай, і праблемай. Але горад спраўляецца... У нас атрымліваецца прадухіляць канфліктныя сітуацыі і папярэджваць сацыяльную напружанасць сярод бацькоў, — запэўніла Марыя Кіндзірэнка. — Наша задача ў гэтай сітуацыі — па-першае, захаваць якасць гімназічнай адукацыі за кошт магчымасцяў вучэбнага плана, а па-другое, не дапусціць парушэнняў пры прыёме і залічэнні ў гімназіі. Дакладны алгарытм нашых дзеянняў вызначаны».

Між іншым, у сталіцы 9718 бацькоў першакласнікаў падалі заявы ва ўстанову адукацыі, за якой іх дом не замацаваны, і 14 463 сям'і — па месцы жыхарства. Пасяджэнне камісій, якія будуць вырашаць лёс будучых першакласнікаў, запланавана на 29 жніўня.

У сувязі з гэтым актуальнасць набывае яшчэ адно пытанне — улік дзяцей у мікрараёнах вакол устаноў адукацыі або, як прызвычаіліся казаць, «усенавуч».

— У гэтым пытанні адсутнічае разуменне з боку нашых сацыяльных партнёраў, у першую чаргу жыллёва-эксплуатацыйных службаў, — канстатавала старшыня камітэта па адукацыі. — Мы звярталі ўвагу на тое, што патрабуецца падключэнне адміністрацыйнага рэсурсу, разлічвалі на садзейнічанне ў гэтым пытанні адміністрацыйны раёнаў, таму што дакладны ўлік дзяцей, якія павінны навучацца, — гэта не толькі планаванне кантынгенту, а ў першую чаргу планаванне аб'ёмаў бюджэтнага фінансавання. Але праз пару тыдняў настаўнікі зноў пойдуць па дамах і кватэрах са славутымі сшыткамі па «ўсенавучы», прычым сабраную імі інфармацыю нельга лічыць абсалютна праўдзівай і аб'ектыўнай, таму што яе атрымліваюць толькі са слоў апытаных жыхароў. Паўгода назад камітэт па адукацыі прасіў раённыя ўпраўленні адукацыі прааналізаваць і пры неабходнасці перараз мяркаваць мікрараёны, замацаваныя за ўстановамі адукацыі, каб пазбегнуць у гэтай рабоце фармалізму. Аднак за летнія месяцы былі выяўлены і праблемныя мікрараёны, і факты лабіравання інтарэсаў асобных устаноў адукацыі, а некаторыя дамы і ўвогуле «згубіліся».

ІДЭЯ НЕ СПРАЦАВАЛА...

Яшчэ адзін важны напрамак — захаванне пераемнасці ў навучанні. Арганізацыя адукацыйнага працэсу з дашкольнікамі будуецца на прынцыпах кампетэнтаснага навучання, закладзеных у дзяржаўнай праграме. Аднак школьныя настаўнікі не заўсёды ведаюць, якімі кампетэнцыямі валодаюць дзеці, што пераходзяць на больш высокую ступень навучання, і, на жаль, не ўлічваюць гэта пры арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Фота Надзеі БУЖАН.

Практыка паказвае, што ў камандзе настаўнікаў-прадметнікаў, якія працуюць у адной паралелі ці ў адным класе, часта адсутнічае ўзгодненасць у пытаннях фарміравання ў школьнікаў асноўных кампетэнцый. А ўдзел навучэнцаў у алімпіядах, інтэлектуальных конкурсах і навукова-практычных канферэнцыях толькі пацвярджае гэта: нярэдка праблемы з выкананнем алімпіядных заданняў абумоўлены недастаткова сфарміраванымі кампетэнцыямі, такімі як камунікатыўныя, даследчыя, аналітычныя і іншыя.

Марыя Кіндзірэнка нагадала, што з новага навучальнага года выхаванцы школ і гімназій будуць мець роўныя магчымасці для вывучэння замежнай мовы і асобных прадметаў на павышаным узроўні, пачынаючы з другой ступені навучання. Акрамя таго, у навучальных планах закладзены гадзіны для арганізацыі працоўнага навучання, дапрофільнай, дапрафесійнай і прафесійнай падрыхтоўкі школьнікаў.

— Трэба разумець, што гэта базавыя магчымасці, на аснове якіх у кожнай школе распрацоўваюцца свае мадэлі працоўнага навучання і падрыхтоўкі вучняў да выбару прафесіі, — звярнула ўвагу удзельнікаў форуму старшыня камітэта. — Асабліва актуальна гэта ў сувязі з увядзеннем у навучальныя планы базавых 10-х класаў абавязковых шасці гадзін прафесійнай падрыхтоўкі. Забяспечыць умовы для іх правядзення — няпростая задача для кіраўнікоў.

Базай для правядзення ўрокаў працы ў 5—9 класах застаюцца пераважна школьныя майстэрні. Вельмі важна, што з новага навучальнага года ў настаўнікаў працы з'явілася магчымасць выбіраць, акрамя базавых, і іншыя тэмы для вывучэння з пераліку, прапанаванага міністэрствам, больш за тое, яны могуць прапаноўваць свае тэмы ў залежнасці ад запытаў бацькоў, пажаданняў дзяцей і наяўнасці рэсурсаў. Вучні 10-х базавых класаў шэсць гадзін у тыдзень будуць займацца ў аддзяленнях прафесійнай падрыхтоўкі школьнікаў на базе прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Сёння ў сталіцы функцыянуе шэсць такіх аддзяленняў.

Актыўна развіваецца ва ўстановах адукацыі і сетка профільных класаў. У 2018/2019 навучальным годзе будуць дзейнічаць 387 дзясятых класаў, з іх 241 — профільны. Педагагічныя класы і групы былі створаны ў 23 установах адукацыі (там навучаліся 240 падлеткаў). Аднак толькі кожнаму пятаму іх выпускніку была дадзена рэкамендацыя для паступлення на педагагічныя спецыяльнасці, а паступілі туды ўсяго 16 % ад агульнай колькасці выпускнікоў педкласаў, прычым большая частка з іх з'яўляецца выхаванцамі адной мінскай гімназіі.

— Як бачым, падрыхтоўка навучэнцаў у класах профільнай накіраванасці пры паступленні ў педагагічныя ВНУ, на жаль, не спрацоўвае, а ўвогуле кажучы, не выконваецца пастаўленымі намі задача — па аднаўленні працоўнага рэсурсу для сістэмы адукацыі горада, — канстатавала Марыя Кіндзірэнка. — Скажу, што толькі адзін гэты прыклад прымушае паразважаць пра пэўную дэвальвацыю ідэі профільнага навучання.

ЭКЗАМЕН, ЯКІ ГОРАД ПРАВАЛІЎ

Высокі клас прадэманстравалі сёлета прадстаўнікі сталічнай сістэмы адукацыі на конкурсе прафесійнага майстэрства «WorldSkills Беларусь»: мінчане заваявалі ў розных кваліфікацыях 19 медалёў. Да таго ж 10 прызёраў увайшлі ў склад нацыянальнай зборнай па падрыхтоўцы да сусветнага чэмпіянату 2019 года ў Казані.

Марыя Кіндзірэнка падкрэсліла, што ўдзел у такіх конкурсах патрабуе сур'ёзнага фінансавання. «Але на самым сучасным абсталяванні трэба рыхтаваць не толькі да ўдзелу ў конкурсах — на ім трэба масава навучаць усіх, хто прыйшоў атрымліваць прафесію. Працэсу абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў прафесійнай адукацыі будзе дадзены новы імпульс. Пры гэтым не варта спадзявацца толькі на бюджэтнае фінансаванне, неабходна пераарыентавацца на працу з заказчыкамі кадраў, выкарыстоўваць у поўным аб'ёме рэсурсныя цэнтры, створаныя на базе прафесійна-тэхнічных устаноў...»

Болевай кропкай для горада застаецца сацыялізацыя маладых людзей з асаблівасцямі развіцця, якія атрымалі прафесійную адукацыю. Атрымліваецца, што права на атрыманне той ці іншай спецыяльнасці яны маюць, але не маюць права на працаўладкаванне, а калі і маюць, то з вялікімі абмежаваннямі. «Экзамен на канструктыўнае міжведамаснае ўзаемадзеянне ў пытаннях працаўладкавання такіх маладых людзей у горадзе не вытрымліваецца, — звяртае ўвагу Марыя Кіндзірэнка. — Адукацыя сваю місію выконвае цалкам. А вось да сістэмы аховы здароўя і да заказчыкаў кадраў пытанні ёсць. Апошнія робяць усё, каб не прыняць на працу маладога спецыяліста з асаблівасцямі. Гэтай сітуацыі можна даць тры ацэнкі. Эканамічную: штогод мы «закопваем» бюджэтныя грошы, рыхтуючы спецыяліста, які нідзе не будзе запатрабаваны. Маральную: малады чалавек і яго бацькі, атрымаўшы надзею на паўнавартаснае жыццё ў грамадстве, потым яе пазбаўляюцца. І грамадскую: пры такім падыходзе мы дыскрэдытуем дзяржаўную задачу па пабудове інклюзіўнага грамадства».

Закранаючы пытанні правядзення ў горадзе выхаваўчай работы, кіраўнік сталічнай сістэмы адукацыі прызнала, што казаць пра кіравальнасць выхаваўчай прасторы пакуль рана. Колькасць праведзеных выхаваўчых мерапрыемстваў не суадносіцца з эфектам ад іх. За 2017 год да адміністрацыйнай адказнасці былі прыцягнутыя ў сталіцы 826 навучэнцаў. Да крымінальнай — 136 непаўналетніх, амаль палова з іх — школьнікі, астатнія з'яўляюцца навучэнцамі сістэмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У падлеткавым асяроддзі прысутнічаюць і алкаголь, і наркотыкі, і псіхатропы. Трывожыць і тая акалічнасць, што больш як 70 працэнтаў злачынстваў былі здзейсненыя падлеткамі, якія раней ні да крымінальнай, ні да адміністрацыйнай адказнасці не прыцягваліся.

Марыя Кіндзірэнка запэўніла, што пра ўсе праблемныя моманты ў камітэце па адукацыі ведаюць: «У прыватнасці, ёсць падстава для разважання па выніках цэнтралізаванага тэсціравання, міжнародных алімпіяд, выпускных экзаменаў. У самы бліжэйшы час гэта стане прадметам крытычнага асэнсавання і абмеркавання. Акрамя таго, з улікам сучасных тэндэнцый будуць карэктавацца і стратэгіі кіравання якасцю адукацыі».

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Вы нам пісалі

НАСТАЛЬГІЯ ПА САПРАЎДНЫМ

...У звяздоўскай «Сямейнай газеце» часам друкуюцца «Нататкі таткі». Але ж аб тым, што хвалюе, баліць, пішуць не толькі яны: пішуць матулі і бабулі-дзядулі, моладзь — пішуць чытачы «Звязды». Дык чытайма разам!

«НЯМА ГОРШАЕ НАПАСЦІ, КАРЫ ГОРШАЕ НЯМА...»

«У дзіўны час мы з вамі жывём, — сцвярджае **спадар Канстанцін Карнялюк з Віцебска** (яго ліст ды іншыя друкуюцца са скарачэннямі). — *То тут, то там адбываюцца розныя культурныя мерапрыемствы: ладзяцца святы і фестывалі, адкрываюцца выстаўкі, выходзяць газеты і часопісы, працуюць бібліятэкі, кінатэатры... Здавалася б, усё выдатна. Аднак тыя ці іншыя мерапрыемствы не вельмі цікавяць сучаснікаў, і тады напаўняльнасць залы забяспечваюць настаўнікі-выкладчыкі, якія «арганізавана» прыводзяць сваіх выхаванцаў.*

Куратары, сябры ды сямейнікі мастакоў з'яўляюцца гледачамі на адкрыцці выставак. Многія ачагі культуры сталі займацца камерцыяй — гандляваць адзеннем ці мёдам. Зачыняюцца вясковыя клубы і бібліятэкі — моладзь перастае чытаць.

Вы скажаце: яна чытае ў смартфонах. Але што? Баюся, розную «жаўцізну», у той час як паліцы кнігарняў, можна сказаць, ломяцца ад нераскупленых добрых кніг, пустуюць кінатэатры. Ды і ў тэатры з музеямі таксама глядач не спяшаецца. Людзі перастаюць падпісвацца на перыёдыку, дзе падаецца праверaная інфармацыя...»

І што ў выніку? — пытае чытач і, магчыма, далей згушчае фарбы: «малюе» тыповую, на яго погляд, карцінку. Маладая сям'я на вуліцы: дзіця (зрэдку двое), побач бацькі, але рукі і вочы ў іх занятыя — цыгарэтамі, смартфонамі і — яшчэ ў лепшым выпадку — бляшанкамі з півам.

«Амаль кожны пакупнік, — працягвае спадар Карнялюк, — *набывае ў краме спіртное і цыгарэты. Шпарка наступаюць наркотыкі, мова многіх нашых сучаснікаў нагадвае мову Элачкі Людаедкі: што ні слова, то мат, альбо «блін», «як бы», «тыпу», «ваў»... Іншымі словамі, пры наяўнасці і даступнасці невысокаэрпнага культурнага патэнцыялу ідзе працэс духоўнай дэградацыі...»*

Чым яна небяспечная, — то прозвай, то вершам піша **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска:** *«Жыву і часта думаю, што бачаць сёння нашы дзеці, што чуюць — на вуліцах, дома? Ці паважаюць, ці любяць сваіх бацькоў, ці маюць з боку асобных хоць кроплю ўвагі ды ласкі? Многія, баюся, не. Перад вачыма ўбачаная ў краме карціна: дзяўчынка гадкоў, можа, трох просіць ляльку — ну хоць патрымаць, адну хвіліначку (я, маўляў, не спэцкаю, не паламлю...). А мама ўжо заплаціла за дзве бутэлькі гарэлкі ды дзве віна...*

І, думаеце, нешта з гэтага аддала потым назад ды купіла дзіцяці цацку? Не! Яна пацягнула дачушку з крамы. А па дарозе, можа, яшчэ і накрычала, каб на лялькі больш не глядзела, не прасіла, не ставіла маму ў няёмкае становішча».

У адказе за дзяцей школа, міліцыя, саветы дэпутатаў, — працягвае шаноўная аўтарка, — яны як могуць ратуюць дзяцей ад... *бацькоў.* Страшней за гэта ўжо, відаць, нічога не прыдумаеш:

«Няма горшае напасці,
Кары горшае няма,
Як няма без чаркі шчасця,
Весялосці без віна...»,

ад якога душы дзяцей поўняцца сорамам і болем, крыўдай і злосцю на ўвесь белы свет.

У што яна выльецца, — здагадацца няцяжка. Малюнак словам і з таго ж канверта:

«Дрэмле прыціхлая хатка
ў вёсцы.
Дах заімшэлы, пахілены тын.
Тут не чакаюць дзетак у госці,
Бо ім тая хата — горкі ўспамін:
Кожны куточак слязамі паліты,
Радасці кволы расточак зачах.
І не забыты, гадамі не змыты
Голад і холад, крыўда ў вачах.
Людзі чужыя малых гадавалі.
Ласка скупая, а бед —
цераз край.
Так што прабач ужо,
хатка старая,
І гадаванцаў сваіх не чакай...»

Яны, тыя гадаванцы, сёння не хочуць успамінаць пра свой боль. Боль, які быў некалі, які ёсць сёння, — «жыве», мо, у хаце непадалёк і які (на думку спадарыні Чыгрынавай) будзе жыць, бо ў крамах на самых відных месцах стаіць спіртное — бяры... Гэта нядорага. Да таго ж...

«Не бываю ў музеі,
На выставы не хаджу,
На «шэдэўры» ў аддзеле
«Вино-водка» пагляджу.
Этыкетка, што карціна,
І бутэлька — эксклюзіў.
Яны з мэтаю адзінай —
Каб народ паболей піў.
І на розных там выставах
Маем гонар паказаць:
«Наша марка!»,
«Ёсць медалі!»,
«Не гарэлачка — сляза!»...
П'ецца часта і з ахвотай,
Кайф такі — не перадаць!
...Слёзы ў хатах будуць потым,
Толькі... што на іх зважаць?»

Нават на дзіцячыя? На жаночыя?..

Імі, сваімі — і зноў жа ў вершах — дзеліцца **спадарыня Лідзія Чайко са Шчучынскага раёна:**

«Не ўратавала малітва
ў Храме, —
Вабіла болей пляшка
ў краме...
Да спавядальні ніхто
не прывёў —
Муж ад гарэлкі ў зямліцу
сышоў.
Я ж, удава, адчуваю віну,
Я, удава, аб'яўляю вайну...»

Шкада, што перамагчы ў ёй цяжка. Ды што там — амаль немагчыма: ад сям'і, ад блізкіх і дзяржавы залежыць шмат, але ж найперш...

«Мне было гадоў, можа, сем, — успамінае **спадар Яўген Шастакоў з Гомеля.** — *Я з бацькамі чакаў парома, каб дабрацца да Чачэрска, і страшэнна хацеў піць (дзень быў вельмі спякотны!). Аднак ні ліманад, ні вада ў вясковай краме не прадаваліся. Я атрымаў бутэльку піва і не выпіў, проста выжлукціў яе — залпам. На смак — адчуў — брыда брыдой, але ж смагу я прагнаў.*

Тым часам да нас падышоў паром, а вось я да яго — ужо не мог: нейкая сіла блытала ногі...

Такім было першае знаёмства з алкаголем.

«Мне катэгарычна не спадабалася, што пасля так званага ўжывання нехта іншы пачынае кіраваць маімі рукамі-нагамі, а самае галоўнае — маёй галавой».

Другое здарылася пазней, калі майму сябру даверылі сачыць за работай самагоннага апарата — у прыватнасці, за агнём...

Гэтага занятку нам, вядома ж, мала было, мы па чарзе сталі падстаўляць пад «капеж» свае лыжкі, смакаваць гатовую «прадукцыю» — самагон...

Апроч яго ў нашай вёсцы «вадзілася» і добра пілася так званая бражка. Я не ведаю, з чаго яе рабілі. Ва ўсякім разе на выгляд яна была, мякка кажучы, не вельмі прывабная, але на смак — не паверыце — нагадвала... шампанскае!

На шчасце, аніводзін з пакаштаваных напояў не здаўся мне настолькі добрым, каб траціць на яго грошы, — падсумоўвае **спадар Шастакоў.** — *Але гэта — па-другое. А па-першае, мне катэгарычна не спадабалася, што пасля так званага ўжывання нехта іншы пачынае кіраваць маімі рукамі-нагамі, а самае галоўнае — маёй галавой. Таму, нягледзячы на даступнасць спіртнога, на яго прыгожыя апраткі ды паэтычныя назвы, я рашуча і на ўсё жыццё сказаў яму — «не».*

Згадзіцеся: пашчасціла чалавеку, а таксама яго бацькам, яго жонцы, дзецям, суседзям — усім, хто, дзякаваць богу, не «падсеў» на ўжыванне алкаголю, не захварэў на залежнасць ад яго. Дзякуючы каму? Ды найперш сабе! То-бок, ён зразумеў і хацеў бы, каб зразумелі іншыя (дзеля чаго, відаць, і пісаў), што не варта глядзець «па баках»: маўляў, у горадзе, у вёсцы, «у тэлевізары» ўсе выпіваюць, дык значыць, і я; не варта «раўняцца на гарбатых», а ўрэшце,

...Не трэба жыць,
як набяжыць.
Так жыць на свеце трэба,
Каб да апошніх дзён любіць
Людзей, зямлю і неба...

«Што значыць любіць? Шкадаваць больш, чым сябе».

Верш — Анатоля Грачанікава. Азначэнне любові — Уладзіміра Караткевіча. А разам яны — што называецца — на роздум. Як і некалькі лістоў у дадатак. Пра што? Пра любоў.

Я Ў ГОРАДЗЕ ЖЫВУ, А СНІЦЦА ВЁСКА

«У кожнага з нас ёсць родны куточак, куды мы спяшаемся, дзе б ні былі, куды мы вяртаемся... Нават тады, калі там нас ніхто не чакае. Для некага, — разважае **спадарыня Антаніна Карпук з Нясвіжа,** — *гэта вуліца ці дом у вялікім ці малым горадзе, для некага — мілая сэрцу вёска, дзе і сонца цяплейшае, і неба вышэйшае...*

Цяпер я разумею сваю старэнькую матулю, якая гасцюючы ў пляменніцы ў Юшавічах, заўсёды глядзела ў той бок, дзе быў яе родны хутар, цяпер я разумею татачку, які нават у свае восемдзесят садзіўся на ровар і ехаў да Слаўкава. Некалі гэта была вялікая вёска, непадалёк ад Нясвіжа, ля кожнай хаты ў ёй цвілі кветкі і стаялі лавачкі. У нядзелю, выгнаўшы кароў у поле, жанчыны збіраліся, каб пасядзець там, пагутарыць...

Аднак з часам моладзь параз'язджалася па гарадах, па свеце, старыя, на вялікі жаль, паўміралі, апусцелі хаты. Нейкія з іх прададзены дачнікам, а нейкія даглядаюць нашчадкі. І калі бачыш, што пад вокнамі па-ранейшаму цвітуць кветкі і бегаюць дзеці, што ўсё дагледжана, хочацца сказаць дзякуй новым гаспадарам!..

Так атрымалася, — працягвае **спадарыня Карпук,** — *што хату мужавых бацькоў нам таксама прыйшлося прадаць, свякроўка па стане здароўя жыве са мной. Але ж, як сказала яе прыяцелька: «Шчаслівая ты, Маня, бо твая хата ў добрых руках».*

Таму і хочацца папрасіць усіх вяскоўцаў — і карэнных, і так званых наезджых, рабіць усё, каб нашы вёскі, як і раней, патаналі ў зеляніне садоў і кветак, каб яны не ўміралі...»

Каб — дададзім — сталіся явай вершаваныя радкі ўжо з іншага, электроннага ліста ад **спадарыні Людмілы Антанюк:**

«...Вёсачка з гадамі
Толькі прыгажэе,
Моладзь застаецца —
Вось і не старэе.
Праўду кажуць людзі:
Дзе ты нарадзіўся,
Дзе ты нарадзіўся —
Там і прыгадзіўся».

У некалькіх пакаленняў вяскоўцаў-папярэднікаў склалася жыццё па-іншаму: не было, а месцамі — што граху таіць! — у вёсках і сёння нямашака працы, якая б годна аплачвалася, не было (і часам няма, на жаль) належных умоў для жыцця. Маладых ды лёгкіх на пад'ём вабілі і вабяць агні далёкіх гарадоў, магчымасць вучыцца, убачыць свет... Людзі сапраўды раз'язджаліся і раз'язджаюцца — цяпер ужо, як правіла, за межы краіны. Каб, магчыма, праз гады (а то і дзесяцігоддзі) вярнуцца... А вось кім? Абураным госцем? Турыстам? Новым гаспадаром у бацькоўскай ці дзедавай хаце?

Лісты — свайго роду нататкі аб гэтым — у пошце таксама ёсць. І мы з вамі іх абавязкова прачытаем.

Валянціна ДОЎНАР,
рэдактар аддзела пісьмаў

■

■ Пытанне-адказ

Прэпарат раздору

Ліст у рэдакцыю даслаў наш пастаянны чытач Аркадзь Абрамавіч Пільшчыкаў са Слоніма. «Апошнім часам з прычыны сталага ўзросту зацікавіўся рубрыкай «Краіна здароўя». Прачытаў вельмі карысную гутарку пра халестэрын з урачом Таццянай Плісюк, апублікаваную ў нумары ад 11 ліпеня», — піша Аркадзь Абрамавіч і просіць больш падрабязна растлумачыць дзеянне прэпарату мілдранат. У прыватнасці, у матэрыяле паведамлялася, што ён паляпшае мазгавую дзейнасць, стан печані і міякарда. Прэпарат свабодна прадаецца ў аптэках, у той жа час у спартсменаў гэта забаронены сродак.



Адказвае загадчык аддзялення прафілактыкі 31-й гарадской паліклінікі Мінска Таццяна ПЛІСЮК:

— Па сутнасці, мілдранат стымулюе метабалічныя працэсы ў нашым арганізме. Дзейнае рэчыва прэпарату — мельдоній — уяўляе сабой структурны аналаг рэчыва, якое знаходзіцца ў кожнай клетцы арганізма чалавека. Ён дастаўляе кісларод у клеткі ў адпаведнасці з іх патрэбай. Таксама адказвае за ачышчэнне клетак ад таксічных прадуктаў абмену і абараняе іх ад пашкоджання. За кошт рэгулярнага ўжывання арганізм вытрымлівае большыя нагрузкі і хутчэй аднаўляе энергетычныя рэзервы. Гэта дазваляе выкарыстоўваць яго для лячэння і прафілактыкі розных праблем сардэчна-сасудзістай сістэмы, кровазабеспячэння мозга. Таксама прэпарат прызначаецца пры павышаных фізічных і разумовых нагрузках. Ён добра падыходзіць пры ішэміі, паколькі здатны скарачаць некратычныя зоны і паскарае перыяд аднаўлення. Пры сардэчнай недастатковасці прэпарат дазваляе павысіць скарачальнасць міякарда і павялічвае ўстойлівасць цела да фізічнай нагрузкі. А з наступленнем ішэмічных парушэнняў мазгавога кровазвароту ён паляпшае цыркуляцыю крыві ў пашкоджанай зоне і садзейнічае пераразмеркаванню крыві на карысць пацярпелага ўчастка. Але ў вострую фазу мілдранат не з'яўляецца прэпаратам першай дапамогі. Таксама яго важна правільна спалучаць з іншымі прэпаратамі, бо ён можа выклікаць гіпатэнзіўны эфект.

Мілдранат прызначаюць у комплекснай тэрапіі пры хранічнай сардэчнай недастатковасці, ішэмічнай хваробе сэрца (інфаркт, стэнакардыя), кардыяміяпатыі, хранічных і вострых парушэннях мазгавога кровазабеспячэння. Таксама ён карысны пры зніжэнні працаздольнасці, у пасляаперацыйны перыяд дапамагае зменшыць тэрмін рэабілітацыі, прызначаецца пры праблемах з сятчаткай вока. У пацыентаў, якія пакутуюць на хранічны бранхіт ці бранхіяльную астму, прэпарат выступае ў якасці імунамадулятара.

Мілдранат каштоўны тым, што дапамагае назапашваць у клетках арганізма неакісленыя тлустыя кіслоты, садзейнічае рэгуляцыі сілкавання клетак кіслародам, актывізуе гліколіз, паляпшае харчаванне мышцаў, за кошт чаго павышаецца эфектыўнасць трэніровак, і зніжае стомленасць. Акрамя таго, мілдранат здольны забяспечваць дадатковую абарону сардэчнай мышцы пры перагрузках. Гэтыя ўласцівасці і сталі асновай для ўключэння яго ў 2016 годзе ў спіс забароненых для спартсменаў ■

■ Скажыце, доктар...

ПРАМЫЎКА «ФІЛЬТРА»,

або Ці варта чысціць печань?

Пазбаўленне ад шлакаў і чыстка печані — сёння даволі папулярныя працэдуры, у тым ліку і ў хатніх умовах. Але ці сапраўды яны патрэбны нашай печані або гэта ўсяго толькі хітрыкі несумленных прадаўцоў БАДаў? Аб тым, чым дапамагчы правільнай рабоце печані, мы пагутарылі з загадчыкам 1-га тэрапеўтычнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі Мінска Сяргеем СЯНЕЦКІМ.

— Ці варта здаровому чалавеку клапаціцца пра сваю печань?

— Клапаціцца варта пра ўвесь арганізм, а не пра адзін асобна ўзяты орган. Наш арганізм — ідэальная сістэма, і кожная яго частка выконвае сваю работу. І калі сэрца, умоўна кажучы, — гэта «помпа», лёгкія — «фільтр» паветра, якое ўдыхаем, то печань — своеасаблівы «фільтр» нашага арганізма. У прыватнасці, ён фільтруе лекавыя прэпараты, менавіта ферменты печані перапрацоўваюць таксічныя спалучэнні ў бяспечную для арганізма форму. Таму чым больш лекавых сродкаў вы прымаеце, тым большая нагрузка на печань. Прычым некаторыя прэпараты выводзяцца праз печань і страўнікава-кішачны тракт, іншыя — ныркамі. Таму калі пацыент мае пячоначную недастатковаць, мэтазгодна прызначаць яму лекавыя сродкі, які будуць выводзіцца ныркамі, каб не нагружаць печань. Нашы паўсядзённая спешка і загружанасць, перакусы на хаду, тлустыя, смажаныя прадукты таксама шкодзяць нашай печані.

— Чаго, дарэчы, не любіць гэты орган?

— Ужыванне алкаголю, тлустых, смажаных, у меншай ступені вострых страў усялякі раз наносіць удар па нашай печані. Людзі, для якіх «свята страўніка» — звычайная з'ява, хто пастаянна пераядае, мае лішнюю вагу, выпівае, могуць мець праблемы. Калі ў здаровага чалавека печань гладкая і мяккая, то ў нездаровага на ёй утвараецца тлушч, у клетках гэтага органа адбываюцца парушэнне абмену рэчываў і дыстрафічныя змены — гепатоз. Тут, канешне, неабходна найперш мяняць лад жыцця: дадаваць адэкватную штодзённую фізічную нагрузку, а таксама вытрымліваць дыету, адмовіцца ад алкаголю. У інтэрнэце сёння няцяжка знайсці і падабраць рацыён з тых прадуктаў, якія любіце, у адпаведнасці з тым захворваннем, якое маецца.

«Неабходна абследавацца, калі без яўных прычын зніжаецца маса цела, з'явіліся парушэнні харчавання, у прыватнасці знік апетыт ці вы пачалі наядацца значна хутчэй, чым раней».

— Печань называюць самым маўклівым органам, які доўга трывае наступствы пераядання. У якіх выпадках варта звярнуцца да ўрача і праверыцца?

— Таго, хто правільна харчуецца, вядзе рацыянальны лад жыцця, не злоўжывае алкаголем, не курыць, печань хутчэй за ўсё турбаваць не будзе. Але ёсць мноства іншых захворванняў, якія пашкоджваюць у тым ліку і печань. Калі з'явілася пачуццё цяжару і распірання ў правым падрабер'і, горыч у роце, жаўтуха, хутчэй за ўсё нагадвае пра сябе печань. Людзям, якія сістэматычна пераядаюць, маюць высокі індэкс масы цела, я параіў бы зрабіць ультрагукавую дыягностыку (УГД) унутраных органаў і здаць аналізы. Таксама неабходна абследавацца, калі без яўных прычын зніжаецца маса цела, з'явіліся парушэнні харчавання, у прыватнасці знік апетыт ці вы пачалі наядацца значна хутчэй, чым раней.

Пацыенты, якія маюць складаныя хранічныя хваробы, інваліднасць, знаходзяцца пад назіраннем урачоў. Раз у тры месяцы яны праходзяць УГД унутраных органаў, пры неабходнасці — эзафагадуадэнаскапію, здаюць лабараторныя аналізы, у тым ліку біяхімічны аналіз крыві на ныркавую і пячоначную пробы. У залежнасці ад вынікаў абследавання ўрач мае магчымасць карэктаваць тэрапію. Часам падчас агляду і дыягностыкі мы вызначаем, што павялічана печань, пытаемся, чаму пацыент не звярнуўся раней. Аказваецца, хворы не звяртаў увагі на сімптомы, цярпеў, стараўся адганяць ад сябе непрыемныя думкі, тым часам стан пагаршаўся — вось так у нас з'яўляюцца запушчаныя формы захворванняў, якія падчас лячэння патрабуюць куды больш намаганняў ад урача і пацыента. Таксама любяць у нас захапляцца біялагічна актыўнымі дабаўкамі, якія быццам бы чысцяць печань, замест таго, каб ісці да ўрача. Канешне, гэта цалкам няправільна.

— І ўсё ж ці варта чысціць печань?

— Я не раіў бы з сябе здзекавацца і прымаць біялагічна актыўныя дабаўкі і астатнія «чысцільшчыкі» печані. Варта весці здаровы лад жыцця, а калі ёсць захворванне, яго трэба лячыць тымі прэпаратамі, што прызначыў урач. Некаторыя пацыенты, дарэчы, паддаўшыся несумленнай рэкламе, просяць што-небудзь прызначыць, каб пачысціць печань. Па-першае, гэта не труба і не смеццевы кош, якія варта чысціць. З унутранай прыборкай наш арганізм спраўляецца самастойна, і печань у дадатковай чыстцы патрэбы не мае. Па-другое, калі вас нешта турбуе, трэба дыягнаставаць захворванне: зрабіць УГД, здаць аналізы. Магчыма, нейкі іншы орган даў збой з ускладненнем на печань. Калі ж пацыент штодзень увечары есць смажаную бульбу з селядцом, то трэба не печань чысціць, а мяняць лад жыцця: пахудзець, наладзіць рацыянальнае харчаванне, адмовіцца ад алкаголю.

— Калі даводзіцца працяглы час прымаць антыбіётыкі або іншыя лекавыя прэпараты, ці трэба дадатковa прымяняць штосьці, каб аблегчыць жыццё печані?

— Разам з антыбіётыкамі,

«З унутранай прыборкай наш арганізм спраўляецца самастойна, і печань у дадатковай чыстцы патрэбы не мае».

канешне, пажадана прымаць гепатапратэктары. З іншага боку, калі пацыенту прызначаецца, скажам, гарачкапаніжальнае, антыбіётык, супрацьвірусны, адхарквальны і прэпарат-антысептык для горла, то нагрузка лекавымі прэпаратамі і так дастаткова высокая. Таму гепатапратэктары прызначае ўрач, зыходзячы з узросту, захворвання і анамнезу пацыента. Калі маецца гепатоз ці цыроз, іх пажадана прымаць. Чалавеку маладога ўзросту дастаткова падчас лячэння больш пільна падыходзіць да харчавання і прытрымлівацца дыеты, каб зменшыць нагрузку на печань. Увогуле пры доўгім прыёме антыбіётыкаў лепш прызначыць прэпарат, які нармалізуе кішэчную флору, бо ў такім выпадку больш пакутуе кішэчнік. У цэлым жа курсы антыбіётыкаў у амбулаторных умовах, як правіла, непрацяглыя. Масіраваная антыбіётыкатэрапія прызначаецца звычайна ва ўмовах стацыянара, дзе пацыент знаходзіцца пад наглядам.

Ёсць прэпараты, якія прызначаюцца пажыццёва ці на вельмі працяглы час, напрыклад, пры артэрыяльнай гіпертэнзіі, цукровым дыябеце, рэўматоідным артрыце. Вось тут пажадана перыядычна праводзіць курсы гепатапратэктараў разам з прэпаратамі для падстраўнікавай залозы. Такія пацыенты, як правіла, знаходзяцца ў нас пад пастаянным назіраннем, здаюць лабараторныя аналізы, тыя ж ныркавую і пячоначную пробы, і лечачы ўрач арыентуецца, якія прэпараты неабходна прызначаць ■

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

■ З нагоды

ЗМЕНА НЕ ПАДВЯДЗЕ

28 жніўня — дзень нараджэння Спецыялізаванага ліцэя МУС

Крыху перадгісторыі. У 2010 годзе рашэннем Мінгарвыканкама ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь было створана Мінскае гарадское кадэцкае вучылішча № 1. У 2013 годзе яму прысвоена імя першага начальніка сталічнай міліцыі Міхаіла Фрунзэ. А 28 жніўня 2015 года вучылішча перападпарадкавана Міністэрству ўнутраных спраў і пераўтворана ў Спецыялізаваны ліцэй МУС Рэспублікі Беларусь.

У лютым 2016 года ліцэй паспяхова прайшоў дзяржаўную акрэдытацыю. Работа па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі ажыццяўляецца па наступных кірунках дзейнасці: стварэнне ўмоў для рэалізацыі права кожнага навучэнца на якасную адукацыю; стварэнне і развіццё адукацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае атрыманне агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама першасных ведаў і навыкаў, неабходных для службы ў органах унутраных спраў; выхаванне годных грамадзян Рэспублікі Беларусь, фарміраванне ў іх дысцыплінаванасці і адказнасці, імкненне да службы ў органах унутраных спраў.

Начальнік ліцэя — генерал-маёр міліцыі Віктар Жыбуртовіч. Тут працуюць педагогі з узроўнем кваліфікацыі вышэйшай і першай катэгорыі. Увагу і клопат да навучэнцаў праяўляюць настаўнікі, выхавальнікі, медыцынскія работнікі.

Асноўная мэта дзейнасці — фарміраванне маральнай законапаслухмянай асобы, здольнай забяспечваць у будучыні нацыянальную бяспеку. У ліцэй прымаюцца юнакі, якія завяршылі навучанне ў 6-м класе, на 2-й ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Прыём ажыццяўляецца на конкурснай аснове па выніках здачы ўступных іспытаў з улікам медыцынскага агляду. Па-за конкурсам пры ўмове атрымання на ўступных іспытах адзнак не ніжэйшы за 4 балы ў ліцэй у парадку выключэння прымаюцца дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў.

Тэрмін навучання — 5 гадоў. На кожным курсе — два класы па 50 чалавек. Навучанне бясплатнае, юнакі знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні. Хлопцы, акрамя формы, так бы мовіць, ваеннага ўзору, атрымліваюць некалькі відаў спартыўнага адзення, а таксама ахоўны камбінезон ад дажджу, красоўкі, бялізну, ранцы для падручнікаў, заплечнікі — увесь набор, неабходны для жыцця і вучобы маладому чалавеку. Ну, і само сабой, падручнікі, якія захоўваюцца ў спецыяльных імянных скрынях. Хлопцы жывуць у камфартабельных пакоях, якія разлічаны на 3-4 чалавекі.

Вучэбны працэс у ліцэі падтрымліваецца на самым высокім узроўні. Выхаванцы займаюцца вельмі старанна. Многія з іх удзельнічаюць у розных конкурсах і алімпіядах, якія праходзяць і па лініі Міністэрства адукацыі, і па лініі МУС. Напрыклад, на рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбных прадметах адзін з навучэнцаў дайшоў на сённяшні дзень да 3-га этапу па беларускай мове, што з'яўляецца вельмі сур'ёзным дасягненнем. А на рэспубліканскай прававой алімпіядзе «Феміда» 2018 года, якую праводзіла Міністэрства ўнутраных спраў, навучэнцы ліцэя занялі ўсе тры першыя месцы.

Асобна трэба адзначыць урокі, якія з навучэнцамі ліцэя праводзяць унутраныя войскі. Хлопцы на месцы вывучаюць тэхніку і зброю беларускай міліцыі. Цяжка пераацаніць значэнне падобных урокаў! Гэта не школьныя падручнікі і плакаты, а ўжо сапраўдная служба. Вядома, падобнае навучанне захапляе падлеткаў.

Вялікая ўвага ўдзяляецца фізічнай культуры. Вучні бегаюць кросы, займаюцца барацьбой, плаваюць у басейне, гуляюць у футбол, валейбол і баскетбол — кожны знаходзіць магчымасць праявіць сябе. Дарэчы, выхаванцы ліцэя ўдзельнічаюць і займаюць прызавыя месцы ўва многіх спартыўных спаборніцтвах і спартакіядах горада і краіны.

Не праходзіць міма навучэнцаў і вялікае грамадскае жыццё. Напрыклад, у парадзе мінулага года, прысвечанага 100-годдзю беларускай міліцыі, удзельнічалі і выхаванцы ліцэя. 50 юных барабаншчыкаў адкрылі парад і сваім выразным рытмам павялі за сабой калоны міліцэйскіх падраздзяленняў. Чым не вялікая падзея і вялікі гонар? З таго часу, дарэчы, юныя барабаншчыкі прымаюць удзел у многіх урачыстых мерапрыемствах.

А на апошнім парадзе ў Дзень незалежнасці ўпершыню крочылі навучэнцы ліцэя. Гэта было нялёгкае выпрабаванне. Але хлопцы вытрымалі ўсе цяжкасці падрыхтоўкі і чаканным крокам прайшлі ў агульнай калоне пад гукі ваеннага марша.

Шмат цікавага адбываецца ў ліцэі. Вучоба, паездкі, сустрэчы, конкурсы, спаборніцтвы — не засумуеш. Хлопцы праходзяць сур'ёзную і сапраўды ўсебаковую падрыхтоўку. Невыпадкова выпускнікі не проста юнакі ў форме, а практычна гатовыя афіцэры. Таму можна быць перакананымі: забеспячэнне бяспекі грамадзян даверана надзейным, адказным і дасведчаным людзям — як яно і павінна быць.

Сяргей КУЛАКОЎ

■ Бяспека

Увага — дзеці!

Хутка пачнецца новы навучальны год. Завяршаюцца школьныя канікулы, дзеці збіраюцца садзіцца за школьныя парты. Многія вяртаюцца ў горад з вёсак ці лагераў адпачынку. Як правіла, у гэты час небяспека звязана з дарожным рухам. Увага яшчэ «летняя», рассеяная. А вакол — інтэнсіўны рух, аўтамабілі, святлафоры, пешаходныя пераходы, і ўсюды трэба захоўваць максімальную асцярожнасць.

Паводле слоў Ганны Банадык, старшага інспектара па асобых даручэннях УДАІ МУС, робіцца ўсё магчымае, каб зберагчы дзяцей ад бяды. Перш за ўсё, у летні перыяд супрацоўнікі органаў унутраных спраў правялі велізарную колькасць розных прафілактычных мерапрыемстваў у аздараўленчых і школьных лагерах. Ажыццяўляўся традыцыйны маніторынг дарожнай сеткі, гэта значыць, праводзілася абследаванне дарог і вуліц, прылеглых да ўстаноў адукацыі, правяраўся стан праезнай часткі, тратуараў, пешаходных дарожак.

Не пакінуты без увагі арганізацыі, якія займаюцца падвозам школьнікаў да навучальных устаноў. Правяраецца тэхнічны стан транспартных сродкаў, інструктажы кіроўцаў, абследуюцца маршруты, а таксама прымаюцца меры засцярогі, якія забяспечваюць надзейнасць падобных перавозак.

У пачатку навучальнага года, з 25 жніўня да 5 верасня, праводзіцца рэспубліканскае комплекснае мерапрыемства «Увага — дзеці!». Інспектары ДАІ і іншыя супрацоўнікі органаў унутраных спраў аб'ядноўваюць свае намаганні для правядзення прафілактыкі дарожна-транспартных здарэнняў як сярод дзяцей, так і сярод дарослых, у першую чаргу, кіроўцаў. Рух у гэтыя дні павінен ажыццяўляцца з уключаным бліжнім святлом фар або дзённымі хадавымі агнямі, калі такія маюцца.

З 1 да 7 верасня ва ўсіх навучальных установах будзе праведзены тыдзень бяспекі дарожнага руху. Супрацоўнікі міліцыі разам з педагогамі прымуць удзел ва ўрачыстых лінейках, прысвечаных новаму навучальнаму году, правядуць з дзецьмі класныя гадзіны, раскажуць, як засцерагчы сябе па-за сценамі школы і дома.

Таксама з 1 верасня для забеспячэння бяспекі маленькіх пешаходаў паблізу школ будзе арганізавана дзяжурства супрацоўнікаў міліцыі. Гэтыя пасты будуць выстаўляцца перад пачаткам заняткаў і пасля для таго, каб аказваць дапамогу дзецям пры пераходзе праезнай часткі, і, вядома, для таго, каб сачыць за парадкам. Многія бацькі падвозяць дзяцей на аўтамабілях і забіраюць іх, і тут важна быць вытрыманымі і ўзаемакультурнымі.

Кожнай школе выдаюцца пашпарты бяспекі, у якіх захоўваецца ўся інфармацыя па арганізацыі і навучанні дзяцей правільным паводзінам. Абнаўляюцца куткі бяспекі, падрыхтаваны будуць аўтагарадкі — усяму гэтаму ўдзяляецца вялікая ўвага, усё гэта з 1 верасня будзе выкарыстоўвацца ў поўную сілу.

З пачатку года на дарогах краіны загінулі 17 дзяцей. З іх 13 — гэта дзеці-пасажыры. 250 непаўналетніх атрымалі калецтвы. Нягледзячы на жорсткі кантроль з боку супрацоўнікаў ДАІ, кожны трэці непаўналетні перавозіцца з парушэннем правілаў дарожнай бяспекі. Адсюль і гэтыя лічбы.

І зноў тут у першую чаргу трэба заклікаць да адказнасці дарослых. Хтосьці пасадзіў дзіця ў дзіцячае крэсла, але забыўся прышпіліць рамянём маленькага пасажыра. Некаторыя перавозяць дзяцей, якія не дасягнулі 12-гадовага ўзросту, на матацыкле або мапедзе. Іншы ігнараваў хуткасны рэжым ці сеў за руль у нецвярозым стане. Увогуле, звычайнае парушэнне правілаў прыводзіць да аварыі, гібелі і траўмаў не толькі кіроўцу, але і таго, хто даверыў яму сваё жыццё, у гэтым выпадку дзіцяці. У сувязі з чым хочацца лішні раз заклікаць да пільнасці і падвышанай асцярожнасці тых, хто кіруе транспартным сродкам. Варта памятаць, што дарога не даруе нядбайнасці. Тым больш цяпер, калі рух асабліва інтэнсіўны.

І яшчэ, што датычыцца дзяцей, канікулаў і навучальнага года. Як расказаў Леанід Ломаць, намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце ДУ «РНПЦ траўматалогіі і артапедыі», існуе такое паняцце, як «трэба ўсё паспець». Іншымі словамі, дзеці, асабліва падлеткі, выявіўшы, што адпачынак скончыўся, а яшчэ многае не зроблена, спрабуюць за тыя дні, што засталіся да вучобы, а то і гадзіны, нагнаць упушчанае. Гэта выліваецца ў гіперактыўныя паводзіны, часам з ужываннем алкаголю. У такія моманты дзеці амаль не кантралююць сябе. А паколькі ўсё наша жыццё так ці інакш праходзіць каля дарог, то ў перыяд «трэба ўсё паспець» мнагакратна ўзмацняецца верагоднасць дарожнага здарэння. Тут ступень адказнасці ўскладаецца не толькі на юных парушальнікаў, але і на іх бацькоў, паколькі менавіта яны павінны сачыць за станам сваіх дзяцей і своечасова папярэджваць магчымыя эксцэсы.

Сяргей КУЛАКОЎ

■ На слыху

Падазраваны зарабіў на «прыгонных» за год суму, эквівалентную 23 тысячам долараў

Калі вы думаеце, што размова пойдзе пра краіны далёкай Афрыкі, глыбока памыляецеся. Усё гэта адбылося, можна лічыць, на нашых вачах у Беларусі. 25-гадовы ўраджэнец Рэчыцкага раёна жыў за кошт таго, што прымушаў людзей жабраваць для яго. І, магчыма, развіваў бы свой цынічны падпольны бізнес і далей, калі б не жаданне адной з ахвяр вызваліцца ад яго прыгнёту.

ЖАБРАКІ ПАНЯВОЛІ

ІНФАРМАЦЫЯ трапіла ў распараджэнне 11-га ўпраўлення ГУБАЗіК МУС Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці. Супрацоўнікі пачалі правяраць інфармацыю і былі ўражаны той дзейнасцю, якую развярнуў малады чалавек. Наогул такі факт упершыню быў афіцыйна зарэгістраваны на тэрыторыі Беларусі.

У Магілёў жыхара Гомельскай вобласці прывялі сямейныя абставіны. Тут жа ў адным з дамоў прыватнага сектара знаходзілася так званая база, дзе ён захоўваў увесь неабходны для работы інвентар: адпаведнае адзенне, інвалідныя каляскі, аб'явы аб дапамозе.

Аб усіх падрабязнасцях гэтай гісторыі расказваць яшчэ заўчасна, бо следства працягваецца. Але ўражваюць нават тыя эпізоды, якія спецыялісты агучылі карэспандэнту «Звязды». Мужчына вербаваў людзей падманным шляхам пад маркай працаўладкавання нібыта для выканання будаўнічых работ, а на самай справе прымушаў іх займацца папрашайніцтвам. У асноўным «бізнес» квітнеў у Беларусі. Яго паднявольныя папрашайнічалі ў Магілёве, Гомелі, Барысаве, Мінску. Але нядаўна следства ўстанавіла новыя факты. Высветлілася, што падазраваны сваіх паднявольных эксплуатаваў не толькі ў межах Беларусі, але вывозіў і ў Расію.

— Адзін з пацярпелых чатыры месяцы жыў у Маскве, — расказваюць спецыялісты. — Яго завезлі туды папрашайнічаць, і грошай, каб адтуль вярнуцца, у яго не было. І калі б не жанчына з фонду міласэрнасці, якая ўнікла ў яго гісторыю і купіла білет на радзіму, невядома колькі б ён яшчэ збіраў міласціну на вакзалах Белакаменнай.

Хутчэй за ўсё, падазроны, адчуўшы сваю бяспакаранасць, такім чынам пашыраў межы дзейнасці. Яго мэтай было паслаць «свайго жабрака» туды, дзе ён зможа сабраць больш грошай. Патэнцыйнымі месцамі «дыслакацыі» былі храмы, рынкі, падземныя пераходы, буйныя гандлёвыя цэнтры. І чым большы горад, тым лепш квітнеў «бізнес».

У Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь за выкарыстанне рабскай працы прадугледжана адказнасць па частцы 2 артыкула 181-1. У згаданым выпадку малады чалавек падазраецца яшчэ па двух артыкулах — частка 2 артыкула 181 (гандаль людзьмі) і частка 2 артыкула 208 (вымаганне). Адна са сведак расказала, што за вызваленне ад рабства малады чалавек патрабаваў ад яе родных тысячу долараў. Маўляў, ён столькі патраціў на ежу, адзенне, утрыманне жанчыны. Хоць, як кажуць самі пацярпелыя, жылі надгаладзь, елі адзін «ролтан» на дваіх на працягу дня. Тыя грошы, якія яны збіралі, мужчына канфіскоўваў, ахвяр сваіх кантраляваў, біў, калі яны спрабавалі частку выручкі ўзяць сабе.

Дробныя грошы, канфіскаваныя падчас вобыску.

У рабства траплялі ў асноўным адзінокія людзі або тыя, якія практычна не падтрымлівалі сувязь з роднымі. Але былі і выключэнні.

— Адна пацярпелая не паведамляла сваім блізкім таму, што было сорамна і страшна казаць, чым займалася, — прыводзяць яшчэ адзін эпізод суразмоўнікі. — Яна з сяброўкай паехала клеіць шпалеры ў Мінск, а іх пад пагрозамі прымусілі сядзець у інвалідным крэсле і прасіць міласціну. Яны былі ў шоку, але збегчы не маглі. Сяброўкі бачылі, што мужчына круціцца непадалёк і назірае за імі. Каля васьмі гадзін вечара ён з яшчэ нейкім мужчынам забраў іх, на машыне адвёз на здымную кватэру і загадаў напарніку закрыць на замок.

На сёння ўстаноўлена, што на падазронага працавалі сем чалавек. Сярод пацярпелых мужчына і жанчыны ва ўзросце ад 20 да 35. Ніхто з іх раней не працаваў, перабіваліся нейкімі выпадковымі заробкамі.

Патэнцыйнымі месцамі «дыслакацыі» былі храмы, рынкі, падземныя пераходы, буйныя гандлёвыя цэнтры. І чым большы горад, тым лепш квітнеў «бізнес».

Падазроны прымушаў займацца папрашайніцтвам увесь светлавы дзень, пакуль ішлі людзі. Чаму не збягалі? Адзін з пацярпелых прызнаўся: так, я мог збегчы, але я ведаў, што ён мяне знойдзе і паб'е. У яго машыне на такі выпадак ляжала біта. На адной з вочных ставак пацярпелы паскардзіўся яшчэ і на тое, што двойчы страчваў ад голаду прытомнасць.

— Элементы гіпнозу і псіхалагічнага ўздзеяння таксама не выключаюцца, — кажуць супрацоўнікі ўпраўлення. — Падазраваны выбіраў ахвяр з ліку малазабяспечаных, слабахарактарных, якімі прасцей кіраваць, і як вампір прысмоктваўся да іх. Гэтыя людзі нават сваім выглядам выклікаюць спачуванне. І «гаспадар» стараўся зарабіць на іх па максімуме. Каб паднявольных выпадкова не пазналі, рэчыцкіх накіроўваў у Магілёў, магіляўчан завозіў у Мінск.

У Магілёве пацярпелыя жылі ў хляве свайго «гаспадара» на прыватным падворку. Справу ён арганізаваў належным чынам. Каб было больш пераканаўча, саджаў здаровых людзей у інвалідныя каляскі і даваў ім у рукі таблічкі з заклікам дапамагчы смяротна хвораму чалавеку. Адна з такіх улётак была знойдзена падчас вобыску. Гэта быў зварот аб зборы сродкаў канкрэтнаму дзіцяці на лячэнне. Прычым родныя хворага нават былі не ў курсе, што на іх сапраўдным нячасці нехта зарабляе.

— Па нашых падліках за дзень збіралася каля 100 рублёў, — удакладняюць праваахоўнікі. — Колькасць папрашаек пастаянна мянялася — штодзень «працавалі» 2-3 чалавекі. Мы падлічылі, што за перыяд з 2017 года да 2018-га падазраваны на сваіх незаконных дзеяннях атрымаў суму больш за 47 тысяч рублёў. Магчыма, людзей, якія трапілі пад уплыў гэтага чалавека, было і болей. Мы звярталіся праз СМІ, але званкоў не паступала. Магчыма, людзі баяцца. Ён жа пагражаў сваім ахвярам. Зараз мужчына знаходзіцца пад арыштам. Устаноўлена кола асоб, якія маглі аказваць яму садзейнічанне. Але пакуль не даказана, што яны таксама прымалі ўдзел у гэтым злачынстве. Хоць пацярпелыя сцвярджаюць, што да іх «гаспадар» прыязджаў не адзін, што ў яго былі хаўруснікі.

Спецыялістаў уразіла нетрадыцыйнасць злачынства для сучасных умоў нашай прававой дзяржавы, дзёрзкасць таго, хто ўсё гэта арганізаваў, і даверлівасць суайчыннікаў, якія кладуць грошы выпадковым папрашайкам. У афіцыйных СМІ вельмі часта гучаць заклікі аб дапамозе хворым дзецям. «Калі ёсць жаданне праявіць міласэрнасць, дапамажыце лепш ім, — раяць суразмоўнікі. — Там усё законна і гарантавана, што грошы будуць патрачаны па прызначэнні. А тут знешнім выглядам ствараецца ілюзія неабходнасці ў дапамозе і знаходзяцца прадпрымальныя людзі, якія імкнуцца на гэтым зарабіць. Яны выкарыстоўваюць адначасова і папрашаек, і чуллівых людзей. Ніводны папрашайка не прынясе гэтыя грошы ў дапамогу камусьці.

Мужчына вербаваў людзей падманным шляхам пад маркай працаўладкавання нібыта для выканання будаўнічых работ, а на самай справе прымушаў іх займацца папрашайніцтвам.

Напярадзе суд, і для пацярпелых адказваць на пытанні суддзі ў прысутнасці чалавека, які з'яўляўся для іх «гаспадаром», таксама свайго роду іспыт. Псіхіка гэтых людзей падаўлена настолькі, што яны ўспрымалі сваё жабрацтва як паўсядзённасць, поўнасцю залежалі ад свайго эксплуататара. Іх гэта паступова засмоктвала і нават дзесьці задавальняла. Ён давёў іх да такога стану, што ў іх ніякай цікавасці да жыцця не было.

«Звычайна крымінальныя справы разглядаюцца ў адносінах да тых, хто распачынае вярбоўку з мэтай вывазу за межы Беларусі ў сексуальнае нявольніцтва. Такога, каб вербавалі людзей для працоўнай эксплуатацыі ў сваёй жа краіне, наогул у нашай практыцы не было. Калі чалавек збірае грошы для сябе, гэта адміністрацыйнае правапарушэнне. Але ён не з'яўляецца ахвярай. Тыя дзеянні, пра якія ідзе размова, злачынныя, і вінаватыя павінны быць пакараны па ўсёй строгасці закона», — заўважаюць спецыялісты.

Пра факты, падобныя гэтаму, праваахоўнікі просяць паведамляць па тэлефоне 102 або ў дзяжурную часць 11-га ўпраўлення ГУБАЗіК МУС Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці 8 (0222) 295080.

Нэлі ЗІГУЛЯ

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность и прав заключения договоров аренды земельных участков в г. Лида и Лидском районе

Аукцион состоится в 11.00 11 октября 2018 г. в г. Лида по ул. Советской, 8.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 5 октября 2018 г. до 15.00.
Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». http://grodnoino.by

Номер лота	1	2	3
Адрес земельного участка, кадастровый номер, площадь	г. Лида, ул. Центральная, У-1288, 423650100013002240, площадь – 0,1071 га	г. Лида, ул. Центральная, У-1297, 423650100013002243, площадь – 0,1141 га	г. Лида, ул. Центральная, У-1268, 423650100013002245, площадь – 0,1009 га
Право на земельный участок	Право частной собственности	Право частной собственности	Право частной собственности
Начальная цена земельного участка, руб.	17 203,98 руб. (семнадцать тысяч двести три рубля девяносто восемь копеек)	18 328,43 руб. (восемнадцать тысяч триста двадцать восемь рублей сорок три копейки)	16 208,05 руб. (шестнадцать тысяч двести восемь рублей пять копеек)
Задаток, руб.	1720 руб. (одна тысяча семьсот двадцать рублей)	1832 руб. (одна тысяча восемьсот тридцать два рубля)	1620 руб. (одна тысяча шестьсот двадцать рублей)
Дополнительное условие	Возместить затраты: За изготовление градостроительного паспорта – 319,45 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона – 895,81 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 63 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку – 66,24 руб.	Возместить затраты: За изготовление градостроительного паспорта – 319,45 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона – 922,32 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 63 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку – 66,24 руб.	Возместить затраты: За изготовление градостроительного паспорта – 319,45 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона – 851,29 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 63 руб.

Номер лота	4	5	6
Адрес земельного участка, кадастровый номер, площадь	г. Лида, ул. Воздушная, 65, 423650100013002286, площадь – 0,1134 га	г. Лида, ул. 3-я Хасановская, У-1215, 423650100011001577, площадь – 0,1492 га	г. Лида, ул. Свердлова, У-1301, 423650100005001037, площадь – 0,1147 га
Право на земельный участок	Право частной собственности	Право частной собственности	Право частной собственности
Начальная цена земельного участка, руб.	16 964,64 руб. (шестнадцать тысяч девятьсот шестьдесят четыре рубля шестьдесят четыре копейки)	25 214,80 руб. (двадцать пять тысяч двести четырнадцать рублей восемьдесят копеек)	19 384,30 руб. (девятнадцать тысяч триста восемьдесят четыре рубля тридцать копеек)
Задаток, руб.	1696 руб. (одна тысяча шестьсот девяносто шесть рублей)	2521 руб. (две тысячи пятьсот двадцать один рубль)	1938 руб. (одна тысяча девятьсот тридцать восемь рублей)
Дополнительное условие	Возместить затраты: За изготовление градостроительного паспорта – 317,65 руб. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона – 954,17 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 79,80 руб.	Возместить затраты: За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона – 514,47 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 51 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку – 264,66 руб.	Возместить затраты: За изготовление градостроительного паспорта – 313,72 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона – 712,19 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 79,80 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку – 62,51 руб.

Номер лота	7	8	9
Адрес земельного участка, кадастровый номер, площадь	г. Лида, ул. Крупской, 423650100006001303, для строительства и обслуживания объекта: «Строительство бесконтактной автомойки на 6 постов для легковых автомобилей», 0,1994 га	г. Лида, ул. Ленинская, 423650100007001044, для строительства и обслуживания объекта: «Квартал многоквартирной жилой застройки (2-3-й этаж) в г. Лида по ул. Ленинская (участок № 2)», 0,6700 га	г. Лида, ул. Ленинская, 423650100007001045, для строительства и обслуживания объекта: «Квартал многоквартирной жилой застройки (2-3-й этаж) в г. Лида по ул. Ленинская (участок № 3)», 0,8327 га
Право на земельный участок	Право заключения договора аренды сроком на 15 (пятнадцать) лет	Право заключения договора аренды сроком на 3 (три) года	Право заключения договора аренды сроком на 2 (два) года
